Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

ГОД ВЫДОЗНЬНЯ—XV
№ 39 (3943)
АЎТОРАК, 10 ЛЮТАГА
1931 г.
Кошт нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Бюджэт голаду, тэрору і вайны

У той час, як мільённыя масы беспрацоўных галадаюць, калі галеча і голад польскае вёскі прынялі нябывалыя разьмеры—

урад мільярды кідае на падрыхтоўку вайны супроць СССР

З прамовы камдэпутата тав. Рожэка ў сойме

ВАРШАВА, 8. У сойме ў спрэчках па бюджэце выступіў тав. Рожэк—адзіны камуністычны дэпутат, які прысутнічаў на бюджэтных спрэчках, бо два іншыя—т. т. Бужынскі і Данецкі—выключаны з сойму на адзін месяц за свае рэвалюцыйныя выступленьні. «Бюджэт, прапанаваны сойму,—заявіў тав. Рожэк,—гэта бюджэт голаду, тэрору і вайны. Трэцяя частка ўсяго бюджэту ідзе на падрыхтоўку вайны супроць СССР. Фактычны-ж расход на армію значна большы, складаючы звыш паловы ўсіх бюджэтных выдаткаў». «У польскай вёсцы, — гаварыў далей тав. Рожэк,—галеча і голад набылі нязвычайныя разьмеры, але сялянне не дазволяць, аднак, рэзаць сябе беспакарана, як бараноў. Рэвалюцыйная сьвядомасьць вёскі прабуджаецца і нарастае. Усё часьцей сялянне выступаюць супроць падатковага грабежніцтва, выганяюць судовых выканаўцаў, уступаюць у бой з паліцыяй. Тав. Рожэк закончыў сваю прамову словамі:

«Рукі прэч ад СССР! Далоў імпэрыялістычную вайну супроць СССР! Вашаму кіраўніцтву голадам і тэрорам, вашай ваеннай падрыхтоўцы рабоча-сялянскія масы Польшчы процістаўляюць сваю рэвалюцыйную барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры і яе агентаў, супроць вайны, у абарону СССР і за савецкую Польшчу».

Сабака фашызму—украінскі фашыст зьбівае ў сойме прадстаўніка рэвалюцыйнага сялянства

ВАРШАВА, 8. У спрэчках па бюджэце міністэрства зямляробства выступіў упершыню ў гэтым сойме дэпутат Ткачук, член левай сялянскай самадапамогі. Ткачук заявіў, што ўрад рабуе бяднякую частну вёскі з мэтай узьняцьця гаспадаркі памешчыкаў і кулакоў. У Пултаўскім павеце яшчэ некалькі год таму назад было ўсяго толькі тры судовыя выканаўцы, цяпер судовых выканаўцаў, якія ацьцягваюць падаткі з бяднейшага сялянства, разьвялося ў гэтым-жа павеце 33.

Старшыня Сьвітальскі пазбавіў Ткачука слова і выключыў яго на месяц з сойму. Калі Ткачук зышоў з трыбуны, член беспартыйнага блёку украінец Скрыпнік падбег і ўдарыў яго ззаду.

Голад сярод беспрацоўных мас

Апошнія часы, як наведамляе польскі буржуазны друк, заміраюць прамысловасьць кожны дзень выкідае ўсё новыя і новыя тысячы беспрацоўных. Так, згодна ўрадавых даных, агульная колькасьць беспрацоўных у канцы студзеня перавысіла 350 тысяч чалавек. Сюды не залічаны сэзонныкі і сельска-гаспадарчыя рабочыя.

З усёй гэтай вялізарнай армії беспрацоўных карыстаецца дапамогай прыблізна трэцяя частка. Дапамога выдаецца ў разьмерах 20-30 грошай у дзень (7-8 кап.) дый-то толькі на працягу 13 тыдняў.

Галеча беспрацоўных набыла страшэнны і нячуваны характар. Старонкі польскага буржуазнага і сацыял-фашысцкага друку стракаюць заметкамі аб самагубствах беспрацоўных з прычыны голаду: адначасова амаль кожны дзень навядамляецца ў друку аб дэманстрацыях і крывавых сутычках беспрацоўных з паліцыяй.

Да якога жудаснага становішча дайшла галеча беспрацоўных, сьведчыць наступны ліст з Пяромышля, зьмешчаны ў сацыял-фашысцкім «Роботніку» № 56 ад 8 лютага.

«Мы знаходзімся не перед зданьню голаду, але ў часы яго фактычнага пакаяньня,—піша адзін з чытачоў «Роботніка».—Голад зазірае ва ўсе хаты беспрацоўнага пралетарыяту. Наглядаю факты, якія могуць прывесьці ў жах нават прывычнага чалавека. Жыву ў адным доме з беспрацоўным, які мае вялікую сям'ю. З некаторага часу я заўважыў, як ён лавіў сабак, забіваў іх і гэтым сабачым мясам кармілася ўся сям'я».

Весткі гэтыя ў органе польскіх сацыял-фашыстаў аб страшэннай галечы і голадзе сярод беспрацоўных Польшчы камэнтараў не патрабуюць

252 мільёны злотых на барацьбу з рэвалюцыйным рухам

Другое месца пасьля вайсковага бюджэту ў фашысцкай Польшчы займаюць выдаткі міністэрства ўнутраных спраў, на чале якога стаіць вядомы кат, крывавы Складкоўскі-Трэпаў — «патронов не жалеть». Фактычна бюджэт гэтага міністэрства зьяўляецца бюджэтам паліцыі, бюджэтам па душэньні рэвалюцыйнага руху як працоўных мас у самой Польшчы, так і нацыянальна-вызваленчага руху ў Зах. Беларусі і Зах. Украіне. А што гэта так, дык самым яркім довадам гэтага зьяўляецца крывавы украінскі пагром, наладжаны фашысцкім урадам увосень мінулага году ў Зах. Украіне і крывавы тэрор у Зах. Беларусі. На бягучы 1931-32 г. на ўтрыманьне гэтага міністэрства асыгноўваецца 252 млн. злотых.

У сапраўднасьці-ж паліцэйскі бюджэт значна вышэйшы, бо акрамя сакрэтных фондаў сюды не даданы сумы, якія трацяцца на ўтрыманьне розных поўвайсковых арганізацый, як «Стралец» і інш. і фашысцкіх баёвак, таксама на шырокую сетку контр-разьведкі, якою, як павуцінньнем, аблытаны Зах. Беларусь і Зах. Украіна. У сучасны момант у кожным, нават самым невялічкім, мястэчку Зах. Беларусі налічваецца цэлыя атрады шпікаў. Уся гэта зграя шпікаў утрымліваецца з фонду міністэрства народнай асьветы пад выглядам розных «культурных» інструктароў і г. д.

Выдаткі гэтага паліцэйскага міністэрства падзяляюцца наступным чынам: на ўтрыманьне кіраўніцтва або самога цэнтральнага апарату—9,3 млн. злотых, з іх 6 млн. знаходзіцца ў непасрэдным распараджэньні самога міністра на розныя «непрадбачаныя» выдаткі, г. зн. на задушэньне выбухаючых у розных мясцох рэвалюцыйных выступленьняў рабочых і сялян. На ўтрыманьне апаратаў ваяводзтваў і старостаў — 39,3 млн. злотых, на санітарны пэрсанал — 15,2 млн. зл., на паліцыю—125,6 млн. зл., на корпус аховы пагранічча—59,2 млн. злотых, на галоўную статыстычную ўправу—3,7 млн. злотых.

У параўнаньні з мінулымі гадамі выдаткі гэтага году прадстаўляюцца ў наступным выглядзе: у 1926-27 годзе было выдаткавана 184 млн. злотых, у 1927-28 годзе асыгнавана 184,7 млн. зл., а выдаткавана было 217,1 млн. зл.—перавыдатак 32,4 млн. злотых, у 1928-29 годзе асыгнавана—217,8 млн. зл., выдаткавана—248,7 млн. зл., перавыдатак —30,9 млн. злотых; у 1929-30 годзе асыгнавана—235,2 млн. злотых, выдаткавана—253,2 млн. злотых, перавыдатак —18 млн. злотых; у 1930-31 годзе асыгнавана—252,9 млн. злотых, а выдаткавана за 8 месяцаў—159,9 млн. злотых.

З паданай таблічкі відаць, што фашысцкі ўрад кожны год па некалькі дзесяткаў мільёнаў злотых выдаткоўваў больш, чым гэта было ўхвалена бюджэтам, а ў апошні 1930-31 год, дык падаў выдаткі толькі за 8 месяцаў. Гэта зроблена неўпадкова. У мінулую восень польскаму фашызму на працягу некалькіх месяцаў прышлося ўтрымліваць карныя экспэдыцыі і нават цэлы карны корпус на акупаваных землях Зах. Украіны і Зах. Беларусі, што каштавала не адзін дзесятак мільёнаў злотых. Вось гэтыя дадатковыя мільённыя выдаткі на расправу з нацыянальна-вызваленчым рухам Зах. Украіны і Зах. Беларусі і не паказаны ў бюджэце за апошнія 4 месяцы, каб затушаваць іх перад працоўнымі масамі.

Штогадовае павялічэньне выдаткаў на паліцыю, дэфэнзыву, сетку сышчыкаў зьяўляецца выразным довадам узросту рэвалюцыйнага руху працоўных мас у фашысцкай Польшчы, бо ўвесь фашысцкі апарат міністэрства ўнутраных спраў накіраваны выключна на барацьбу супроць рэвалюцыйнага руху, якім прычыны цяжкага эканамічнага крызісу, а таксама дзеючы энэргічнай растлумачальнай работе кампартыі Польшчы, усё больш і больш узмацняецца і захапляе нават самыя адсталыя колы як рабочай клясы, так і працоўнага сялянства.

Новы катаржны прысуд у Вільні над б. паслом Дварчанінам

У Вільні 7-га лютага ў акруговым судзе адбыўся чарговы палітычны працэс. За апошнія часы перад помсьлівым абліччам фашысцкага суда прайшлі асуджаньня ім на шматгадовую катаргу сотні і тысячы лепшых прадстаўнікоў рабочай клясы і сялянства.

На гэты раз з лаўкі падсудных адказвалі за рэвалюцыйную дзейнасьць: былы пасол беларускага рабоча-сялянскага клюбу «Змаганьне» Дварчанін, які ўжо атрымаў два катаржныя прысуды ў 6 і 8 год, далей грам. Гавэнда і работніца Каган. Усе абвінавачваліся па 129 арт. старога царскага кодэксу.

Пасол Дварчанін адказваў за рэвалюцыйную прамову ў Вільні на мітынгу. Гавэнда і Каган за тое, што гэту прамову слухалі. Камедыя фашысцкага суда скончылася хутка: б. пасол Дварчанін атрымаў 3, а Гавэнда 2 гады катаржных работ.

Краіне бальшавізму належыць будучыня

„Ротэ Фанэ" аб прамове тав. Сталіна

БЭРЛІН. 8. «Ротэ Фанэ» друкуе сёньня лічбовыя даныя аб савецкіх заказах, разьмешчаных у Нямеччыне. Робячы параўнаньне сумы савецкіх заказаў за першыя тыдні студзеня 1931 г. з адпаведнай сумай 1930 году, «Ротэ Фанэ» заяўляе:

«гэтых нямногіх даных даволі, каб паказаць надзвычайнае значэньне, якое мае сацыялістычнае будаўніцтва ў СССР для працоўных Нямеччыны. Эканамічны крызіс у Нямеччыне быў-бы яшчэ глыбейшым, а беспрацоўе яшчэ больш значнае, калі-б краіна пераможнага сацыялізму не давала-б нямецкім працоўным хлеба і работы, якіх капіталістычная Нямеччына ім больш даваць ужо ня можа. Бясспрэчным фактам зьяўляецца тое, што вядзеньне спраў у СССР прадстаўляе для капіталістычнай Нямеччыны поўныя карысьці, што аднак не перашкаджае нямецкім прадпрыемцам весьці ў купленай імі прэсе бессаромнае цкаваньне СССР, скарыстоўваючы для гэтага так званы «дэмпінг». Няхай яны вядуць цкаваньне. Яны тым самым толькі кепска скрываюць свой панічны страх перад далейшым разьвіцьцём крызісу ў той час, як краіне бальшавізму, якой тысячы разоў прадракалі крах, і дзе зараз шпаркімі тэмпамі, будуецца сацыялізм, —гэтай краіне прыналежыць будучыня. Аб гэтым гаворыць сьмелая і прасякнутая ўпэўненасьць у перамозе, прамова тав. Сталіна на зьезьдзе работнікаў прамысловасьці. Гэту прамову мы сёньня друкуем поўнасьцю. Яна зьяўляецца гістарычным дакумэнтам, які мае надзвычайнае значэньне і для нашай барацьбы. Нямецкі рабочы павінен уявіць сабе, што нават буйнейшыя савецкія заказы Нямеччыны ня могуць даць рашучай зьмены яго становішча.

Бальшавіцкія посьпехі, ператвораныя ў масавую сілу, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Нямеччыны навядуць рабочых на барацьбу супроць эксплёататараў і адчыняць ім вароты ў сацыялізм».

ВЫКАНАЦЬ абавязацельствы перад дзяржавай

САМАЦЁЧНЫМ НАСТРОЯМ І ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ ДАЦЬ БЯЗЬЛІТАСНЫ АДПОР, ПРЫМУСІЦЬ КУЛАКА ЗДАЦЬ ЛЁН

ПЕРАДАВЫМ РАЁНАМ ПРЭМІІ—АУТАМАБІЛЬ І ПРАМТАВАРЫ ЗВЫШ ПЛЯНУ

Учора адбылося пасяджэньне чацьвёрки ЦК КП(б)Б і СНК БССР па ільназагатоўках.

На пасяджэньні былі заслуханы паведамленьні загатоўчых арганізацый, пракуратуры і прафсаюзаў аб мерах, прынятых імі ў сувязі з абвешчанай чакалай штурму па ільназагатоўках.

Чацьвёрка ўстанавіла, што першая пяцідзёўка лютага не дала значнага ажыўленьня ў ільназагатоўках. Сярэдні процант выканаўня дасягнуў толькі 27. Па ільняных раёнах выканан на 36,6 проц., садова-гародных —на 17,2 і жывёлагадоўчых—на 12,5.

Па лініі Белкаапсаюзу толькі 7 раёнаў павысілі тэмп загатовак да 5 проц. у параўнаньні з папярэдняй пяцідзёўкай, усе іншыя павысілі на 1-2 проц. У абсалютных лічбах першая пяцідзёўка лютага па лініі Белкаапсаюзу дала зьніжэньне на некалькі дзесяткаў цэнтнэраў.

Поўная бязьдзейнасьць выкрылася па лініі садова-гародняга цэнтру, які павінен загатовіць 8 тыс. цэнтн. Кіраўнік цэнтру ня ведае пляну загатовак ільну па сваёй сыстэме. Ніякіх мер па павышэньні тэмпу загатовак ім ня было прыдумана.

Некаторае паляпшэньне ў загатоўках адбылося ў сыстэме ільнасаюзу, але ў такіх разьмерах, якія не даюць падставы рабіць заключэньне, што сыстэма па-баявому перастроілася на выкананьне заданьняў па ільне. Характэрна, што таварышы, мабілізаваныя на ільназагатоўкі, яшчэ ня выехалі на месцы.

Па лініі прафсаюзаў амаль нічога ня зроблена. І толькі ЦК СГЛР накіравала на месцы 15 ажазных работнікаў і арганізуе 200 брыгад у раёнах для садзейнасьці ільназагатоўкам. Пракуратура яшчэ ня ўжыла спэцыяльных захадаў у адносінах да злосных нядатчыкаў ільну.

Органы спажывецкай кааперацыі на месцах не дапамагаюць выкананьню заданьняў ільну, адмаўляючыся забясьпечваць здатчыкаў ільну прамтаварамі, вецьцяжнай перад іншымі, наперакор краёў усіх дырэктывам, якія ёсьць наконт гэтага.

Агульны вывад, да якога прыйшла чацьвёрка — загатоўчыя ўсё яшчэ бязьдзейнічаюць, прадстаўнікі Ільнасаюзу толькі ўчора выехалі на месцы ў той час, калі дэкада штурму пачалася 5 лютага.

Чацьвёрка прапанавала неадкладна выканаць усе канкрэтныя мерапрыемствы, прынятыя штабам штурму, і неадкладна давесьці іх да раёнаў. Асноўны ўпор у дэкаду штурму павінен быць зроблен на лініі нэпіску на кулака, якога трэба прымусіць выканаць заданьні па ільне, дабіцца выканаўня абавязацельстваў кантрактантамі, абавязаць калгасы закончыць апрацоўку трасты і выканаць цалкам заданьні па ільне.

Для стымуляваньня ільназагатовак чацьвёрка прапанавала Наркамгандлю на наступным пасяджэньні падаць чарговы рэзаў, якія з посьпехам выканастычны ільназагатоўкі, для прэміраваньня іх аб Чырвонымі і прамтаварамі звыш пляну.

Прапанаваць адпаведным сыстэмам кааперацыі праверыць, чаму не выдаецца прэміраваньне па ільне нявайцыкам, або пайшчыкам з вышоўным паем.

Лічыць неабходным, каб і ў далейшым друк, у тым ліку і раённы, разгарнуў брашуру па ільназагатоўках, асабліва ў сувязі з праводзімым цяпер двухдэкадніканм штурму.

Лічыць неабходным, у сувязі з праводзімым двухдэкадніканм штурму, прыцягненьне і мабілізаваньне для праведзеньня пасеўнай кампаніі таварышоў.

Папярэдзіць усіх старшынь РВК, якія не зрабілі дакладу на СНК, а таксама і тых, якія ўжо зрабілі даклады аб ільназагатоўках, што ў часе Усебеларускага зьезду саветаў будуць пастаўлены іх даклады на пасяджэньні СНК і чацьвёркі аб ходзе выканаўня ільназагатовак.

У сувязі з надыходзячым Усебеларускім зьездам саветаў абавязаць РВК загадзя выслухаць адказных асоб, на якіх усклаўці адказнасьць за працягваньне з неаслабным тэмпам загатовак ільну на час зьезду.

Даручыць т. Вербе высьветліць, у якіх сыстэмах кааперацыі знаходзяцца ільнамашыны і як яны скарыстоўваюцца.

Прапанаваць усім цэнтральным установам, у якіх ёсьць такія машыны, прадставіць да заўтрашняга дня т. Вербе адпаведны матэрыял.

Даручыць т. Грэбенчыку (дырэктару Белсельтрэсту) і ўпаўнаважанаму Галоўленкому на недапушчальнасьць няўкі на пасяджэньне чацьвёркі па ільназагатоўках і папярэдзіць, што ў выпадку патаўрэньня такіх зьявішч будуць прыняты меры адміністрацыйнай узьдзейнасьці.

Адзначыць няўку на гэта пасяджэньне прадстаўніка ЦК ЛКСМБ у чацьвёрцы т. Рудніцкага.

Саўгасы Галоўленкому

НЕ ЗАБЯСЬПЕЧАНЫ НАСЕНЬНЫМ І ЎГНАЕНЬНЕМ

План засеву ільну і канапель пад пагрозай

Чакаем адказу Наркамзему БССР

Галоўленком — арганізацыя маладая.

Сваю працу Галоўленком па БССР распачаў з першага сьнежня 1930 году пасьля таго, як пастановай ураду было рэарганізавана ільнапяньковае аб'яднаньне пры ВСНГ БССР.

Зараз Галоўленком абслугоўвае ільнаканапляводуд, ільнаканапельапрацоўку і ільнаканапляводтрэст.

У сыстэму Галоўленкому ўвайшлі чатыры буйнейшыя саўгасы: «Дзесяцігодзьдзе БССР»—з зямельнай плошчай у 8.500 гэкт., Загальле—з плошчай у 44 тыс. гэкт., Бігосава—з плошчай у 2.500 гэкт., Боркавічы—з плошчай у 7.400 гэкт.

У пачатку студзеня 1931 г. у сыстэму Галоўленкому перайшлі яшчэ два саўгасы: «Крывіна сьвечка»—з зямельнай плошчай у 7.400 гэкт. і «Абрубачысьцель»—з плошчай у 1.100 гэкт.

У сувязі са спэцыялізацыяй сельскай гаспадаркі на капітальнае будаўніцтва і пашырэньне гэтых саўгасаў у 1931 рашаючым годзе пяцігодкі мяркуецца адпусьціць: Саўгасу «Дзесяцігодзьдзе БССР»—300 тыс. руб., Загальле—200 тыс. руб., Бігосава — 100 тыс. рублёў, Боркавічы—150 тыс. руб.

Складаюцца каштарысы выдаткаў і на капітальнае будаўніцтва саўгасаў «Крывіна сьвечка» і «Абрубачысьцель».

Вялікія сродкі адпускаюцца на мэліярацыйныя работы. Саўгасу «Дзесяцігодзе БССР» вызначана 176 тыс. руб., Загальле—126 тыс. руб., Бігосава—26 тыс. рублёў, Боркавічы—51 тыс. руб.

Адпускаюцца, апрача таго, грошы па карчоўку для саўгасу Боркавічы — 50 тыс. руб., Бігосава—21 тыс. руб.

1.200 млн. руб., якія прызначаны на разьвіцьцё спэцыяльных саўгасаў Галоўленкому, значна ўзмоцняць эканамічную базу гаспадарак, павялічаць пасеўную плошчу пад важнейшыя культуры сельскай гаспадаркі ільну і канапель.

Гэта праграма будаўніцтва саўгасаў па сыстэме Галоўленкому ставіць надзвычай вялікія задачы, вырашэньне якіх дасьць магчымасьць у значнай ступені ўзмацніць нашу работу ў барацьбе за тэхнічныя культуры.

Пад засеў рознага гатунку культур у бальшавіцкую вясну 1931 г. саўгасамі Галоўленкому падрыхтавана 6.850 гэкт. пахаці.

Саўгас «Дзесяцігодзьдзе БССР» падрыхтаваў пад засеў 3.100 гэкт., з іх 1.600 гэкт. прызначана пад засеў канапель.

Саўгас Загальле пад засеў канапель адводзіць 1.000 гэкт. і 500 гэкт. пад засеў іншых культур.

1.000 гэкт. пахаці пад засеў ільну вызначыў саўгас Боркавічы.

Саўгас Бігосава падрыхтаваў пад засеў 650 гэкт., з якіх 300 гэкт. вызначана пад засеў культуры ільну.

Але кіраўніцтва Галоўленкому, памяншаючы пляны засеву ільну і канапель, зрывае падрыхтоўку саўгасаў да вясны.

«Плянаваньні» і «праэкты» Ільнаканапляводтрэсту аб засеве ўсяго 2.200 гэкт. зямельнай плошчы канопляміі і ільном могуць высоўвацца толькі апартуністамі, работа якіх накіравана на зрыў высокіх тэмпаў індустрыялізацыі і разьвіцьця сацыялістычных форм сельскай гаспадаркі.

Гэтыя «плянавыя меркаваньні» Ільнаканапляводтрэсту нічога агульнага ня маюць з устаноўкай партыі, з яе генэральнай лініяй.

Пляны засеву ільну і канапель, якія склаў у апошнія часы Ільнаканапляводтрэст, павінны быць зараз-жа перагледжаны і безадкладна павялічаны.

Падрыхтоўка да веснавой сяўбы саўгасаў Галоўленкому праходзіць яўна нездавальняюча.

Насеньнем саўгасы не забясьпечаны. Не хапае яшчэ фасфарытнага ўгнаеньня 1.722 тон і калійных угнаеньняў 2.015 тон. Застаецца без угнаеньня 3.300 гэкт. падрыхтаванай глебы.

НКЗ БССР ніякіх захадаў для забясьпячэньня саўгасаў Галоўленкому мінэральным угнаеньнем ня робіць.

Гэтыя факты гавораць аб тым, што пляны сяўбы па саўгасах Галоўленкому знаходзяцца пад рэальнай пагрозай.

Спэцыялізацыя саўгасаў Галоўленкому ў напрамку засеву ўсёй зямельнай плошчы ільном і канаплямі, бурны рост сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі і ператварэньне паўночных раёнаў БССР у суцэльныя фабрыкі па вытворстве тэхнічных культур—паспраўдзе ставяць пытаньне аб будаўніцтве заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну і канапельнай трасты.

У 1931 г. ў БССР пачнецца пабудова 4-х заводаў па першапачатковай апрацоўцы канапель і 16 заводаў па першапачатковай апрацоўцы ільну.

Заводы будуць будавацца пры МТС і саўгасах.

50 проц. заводаў павінны быць пушчаны ў кастрычніку 1931 г. і іншыя —да першага студзеня 1932 г.

Будаўніцтва гэтых заводаў ліпіі раз прымушае паставіць пытаньне аб каранным перагляздзе плянаў сяўбы канапель і ільну, якія склаў Ільнаканапляводтрэст.

6.850 гэкт. пахаці па 4 саўгасах Галоўленкому павінны быць цалкам засеяны канаплямі і ільном.

Вар. ГАЛІН.

ПАПРАЎКА.

У «Зьвязьдзе» № 38 па вінаддаелу абвестак і карэктуры дапушчана прыкрая памылка ў абвестцы аб скліканьні пленуму ЦКК КП(б)Б подпіс надрукаваны: «ЦК КП(б)Б», трэба «ЦКК КП(б)Б».

Вінаватыя ў гэтай памылцы атрымаюць спагнанне.

Аб рэканструкцыі рэчнага транспарту

ДА УСІХ ПАРТЫЙНЫХ, САВЕЦКА-ГАСПАДАРЧЫХ І ВОДНА-ТРАНСПАРТНЫХ, ПРАФСАЮЗНЫХ І КАМСАМОЛЬСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ

За подпісам старшыні СНК СССР тав. Молатава і сакратара ЦК УсеКП(б) тав. Сталіна апублікавана адозва СНК СССР і ЦК УсеКП(б) да ўсіх партыйных, савецка-гаспадарчых, водна-транспартных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый аб рэчным транспарце. Пастанова канстатуе, што рост народнай гаспадаркі СССР патрабуе ад рэчнага транспарту карэннай перабудовы яго работы ў адпаведнасьці з тэмпамі разгорнутай сацыялістычнай рэканструкцыі. Гаспадарчае становішча рэчнага транспарту не адказвае ўзросшым да яго патрабаваньням з боку народнай гаспадаркі. З году ў год паўтараецца невыкананьне вытворчай праграмы, ня прыступлена да гэтага часу да рэканструкцыі, вельмі высокі процант аварыйнасьці, ня выканана дырэктыва ЦК аб ажыцьцяўленьні аднаначальня, слаба разгорнута сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Улічваючы ўсё гэта, СНК СССР і ЦК УсеКП(б) лічаць неабходным неадкладна правесьці ў жыцьцё наступныя мерапрыемствы.

Наркамаводу прапануецца ў 2-хмесячны тэрмін закончыць распрацоўку пляну рэканструкцыі рэчнага транспарту. Не чакаючы поўнай распрацоўкі пляну рэканструкцыі, павінны быць устаноўлены па асобных басэйнах і відах грузаў найбольш рацыянальныя тыпы суднаў, рэканструяваны існуючыя суднарамонтныя майстэрні і т. д. Для гэтага павінны быць скарыстаны 215 млн. рублёў, якія адпускаюцца на капітальныя работы ў рэчным транспарце на 1931 год.

ВСНГ абавязваецца ўстанавіць цьвёрды каляндарны плян на выпуску суднаў, бяэмоўна, абавязковы да выкананьня, з тым, каб забясьпечыць выпуск у тэрмін суднаў, прызначаных да навігацыі ў 1931 годзе. У 2-хдэкадны тэрмін ВСНГ павінен замацаваць за судабудаўнічай прамысловасьцю неабходныя заводы, якія вырабляюць падсобныя мэханізмы, а таксама вылучыць дадаткова з рэзэрвовага фонду 50 млн. рублёў для патрэб рэканструкцыі суднабудаўніцтва і пабудовы новых верфяй, у прыватнасьці Чырвонаармейскай, Пермскай і Дзсчацінскай.

Наркамвод і ВСНГ павінны ў месячны тэрмін вырашыць пытаньне аб тыпе бэнзінавозу і сумесна вызначыць плян будаўніцтва бэнзінавозаў як на заводах рэчсаюзэрфі, так і ў майстэрнях —аб'яднаньнях рэчнага транспарту. У месячны тэрмін павінны быць вызначаны заводы, на якіх можа быць разгорнута будаўніцтва тэхнічнага рэчнага флёту. Не пазьней і сакавіка 1931 году павінен быць скончан перавод на гаспадарчы разьлік усіх суднарамонтных майстэрань 1-га і 2-га разраду. Важнейшыя заводы і майстэрні, затоны павінны быць аб'яднаны ў самастойныя гаспадарчыя аб'яднаньні па рамонце суднаў. За сваячасовае выкананьне пляну суднабудаўніцтва і рамонту павінны несьці пэрсанальную адказнасьць начальнікі затонаў і адміністрацыі пазаў.

З мэтаю узмацненьня тэмпу мэханізацыі пагрузачна-разгрузачных работ на водным транспарце Наркамвод абавязваецца разгарнуць ва ўласных майстэрнях выраб прасьцейшых сродкаў мэханізацыі і распрацаваць канкрэтны плян прыняцьця мэханізацыі пагрузачна разгрузачных работ на водным транспарце.

У сувязі з тым, што суднаходныя рэкі, у тым ліку такія важнейшыя артэрыі, як Волга і Дняпр, надзвычай запушчаны, што стварае пагрозу нармальнаму суднаходству, СНА павінен разгледзець пытаньне аб сыстэматычным упарадкаваньні суднаходных рэк. Мясцовым выканкомы абавязваюцца прыняць меры на ачышчэньні мясцовых рэк і забясьпячэньні нармальных лясных сплываў.

Да 1 сакавіка для паўночных раёнаў і да 15 сакавіка для паўднёвых раёнаў павінны быць распрацаваны і паведамлены на месцы цьвёрдыя планы перавозак у навігацыю 1931 году. Пры гэтым павінна быць устаноўлена матэрыяльная і судовая адказнасьць кліентуры за непрадастаўленьне грузаў у вызначаныя плянам тэрміны, і такая-ж адказнасьць воднага транспарту за непадачу таннажу і цягі.

Арганізацыйная структура рэчнага транспарту карэнным чынам зьмяняецца. Судно, як першапачатковая гаспадарчая адзінка, прыраўноўваецца да прадпрыемства, павінна працаваць на аснове гаспадарчага разьліку і мець цьвёрды прамфінплян.

Арганізуецца каля 50 раённых кіраўніцтваў рэчнага флёту. Замест існуючых 23-х дзяржпараходзтваў ствараюцца наступныя 15 пароходзтваў: волжае, маскоўска-окскае, камскае, дняпроўскае, дняпрадзьвінскае, паўночна - заходняе, паўночнае дона - кубанскае, закаўкаскае, сярэдня - азіяцкае заходня - сібірскае, янісейскае, усходня-сібірскае, ленскае і амурскае. Акрамя таго, на рацэ Урал ствараецца раённае кіраўніцтва, падпарадкаванае непасрэдна Наркамводу. Існуючыя агенцтвы дзяржпараходзтваў ліквідуюцца.

У мэтах паляпшэньня работы камандных складу пароходаў, замацаваньня кваліфікаваных кадраў рабочага і каманднага складу на рэчным транспарце і павышэньня прадукцыйнасьці іх працы, Наркамвод разам з ЦК водпрацаў абавязваецца ў месячны тэрмін правесьці павышэньне зарплаты работнікаў рэчнага транспарту, зьвязанае з павышэньнем якасьці работы. Дадаткова да тарыфнай аплаты ўводзіцца тонажнёмэтравая аплата працы капітанаў, мэханікаў, памочнікаў капітанаў і мэханікаў, старшых поцманаў, рулявых, масьлянщыкаў і качагараў, прычым для апошніх яшчэ ўстанаўляюцца прэміраваньні за эканомію апалу.

Да 1-га сакавіка бягучага году цалкам быць створана водная кааперацыя па структуры, устаноўленай для кааперацыі рабочых - чыгуначнікаў. Наркамснабу і Цэнтрасаюзу даручаецца арганізаваць закрытыя разьмеркавальнікі ў найбольш буйных затонах і водных басэйнах, рэгуляцыя забясьпечваючы іх па ўстаноўленых нормах.

Адзначаючы, што партарганізацыі рэчнага транспарту вылучэньня найбольш адсталымі ў пастаноўцы партыйнай і масава-вытворчай работы ў параўнаньні з партарганізацыямі іншых галін народнай гаспадаркі, ЦК УсеКП(б) і СНК прапануюць мясцовым партыйным і камсамольскім арганізацыям цэнтр увагі ўсёй работы згуртаваць на ачышчэньні барацьбе з прагуламі, рвачамі, за ўзьнімцьце працоўнай дысцыпліны, а ачышчэньні на перадавых колы рэчнага транспарту, на ўдарні.

Рацыяналізатарскія прапановы—

у фонд імя „Зьвязды"

„Будзем рашуча і энэргічна праводзіць рацыяналізацыю, змагацца за выкананьне і перавыкананьне рацыяналізатарскага пляну, за хутчэйшае ажыцьцяўленьне рабочых прапаноў"

МЭТАДЫ РАБОТЫ „БАЛЬШАВІКА" ПАШЫРЫЦЬ ПА ЎСІХ ФАБРЫКАХ І ЗАВОДАХ

РАПАРТ ЦО КП(б)Б ГАЗЭЦЕ „ЗЬВЯЗДА"

Бюро рацыяналізацыі і «БРИЗ» чырвонасьцяжнай гарбарні «Бальшавік» вітае баявы орган КП(б)Б — газэту «Зьвязда» і адно з першых на пачынаньні — АГЛЯД СТАНУ РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Мы рапартуем «Зьвязьдзе»:

У другім годзе пяцігодкі і ў асобным квартале гарбарня «Бальшавік» дасягнула вялікіх посьпехаў на рацыяналізатарскім вучастку сацыялістычнага фронту. У 1929 г. на заводзе ня было рацыяналізатарскага органу. Рацыяналізацыя знаходзілася на задворках. Творчая рабочая ініцыятыва часта не заахвочвалася. З моманту пуску гарбарні да 1929 г. была выдана ўсяго АДНА ПРЭМІЯ за рацыяналізатарскую прапанову Ў СУМЕ 5 РУБ. У 1930 г. быў прэміраваны 31 чалавек на суму 2.610 руб., а ў асобным квартале — 23 чал. на суму 1.426 руб. За ўвесь 1929-30 год паступілі 342 прапановы, а за адзін асобны квартал — 296. Гадавая эканомія ад выкананьня рабочых прапаноў у 1929-30 годзе складае 41.124 руб. 32 кап. (умоўна, бо эфэкт улічан толькі па 23-х прапановах). Гадавая эканомія ад прапаноў за асобны квартал складае 37 тыс. руб.

Праводзячы рацыяналізацыю ў 1930 г., мы імкнуліся нагнаць прапушчанае за папярэднія гады і дагнаць у галіне пастаноўкі вытворчасьці перадавыя гарбарныя прадпрыемствы.

У выніку плянавых і па-заплянавых рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, праведзеных у 1929-30 годзе, атрымана 600 тыс. руб. эканоміі. Плян рацыяналізацыі на 1931 год прадугледжвае атрыманьне эканоміі у суме 331.566 руб., ня лічачы сустрэчнага пляну рацыяналізацыі, які павінен даць дадаткова 18 тыс. руб. эканоміі.

Намі праводзілася і праводзіцца шырокая папулярызацыя рацыяналізацыі мэтадам выпуску бюлетэняў, скліканьня агульна-заводзкай канферэнцыі аўтараў рабочых прапаноў, стварэньня фота-вітрын і выстаўкі і г. д. Рабочыя прапановы даведзены да варштату шляхам вывешваньня зводак аб паступіўшых прапановах і аб выніках разгляду іх.

Побач з дасягненьнямі мы павінны ў парадку самакрытыкі паказаць і на адмоўныя бакі. Арганізаваная намі экспэрымэнтальная брыгада для выкананьня рабочых прапаноў працуе з перабоямі. Ажыцьцяўленьне раду рабочых прапаноў і рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў спазьняецца.

Гэтыя асноўныя дэфэкты ў нашай работе павінны быць неадкладна зьніжаны. Пастаўленыя перад пралетарыятам вялікія задачы ў трэцім годзе пяцігодкі, пераходны сьцяг імя ЦСПСБ, атрыманы намі за добрую работу, усклядаюць на гарбарню «Бальшавік» адказныя задачы і ў галіне рацыяналізацыі. Гэтыя задачы набываюць асаблівае значэньне яшчэ і таму, што мы перажываем сырцовыя труднасьці і нам трэба шляхам рацыяналізацыі дабіцца павялічэньня плошчы скур, дабіваючыся максымальнага скарыстаньня сырцу, каб поўнасьцю забясьпечыць абутковыя прадпрыемствы поўфабрыкатамі.

Мы запэўніваем «Зьвязду», што будзем у далейшым больш рашуча і энэргічна праводзіць рацыяналізацыю, змагацца за выкананьне і перавыкананьне рацыяналізатарскага пляну, за хутчэйшае ажыцьцяўленьне рабочых прапаноў. Адным з магутных вагароў пасьпяховага ажыцьцяўленьня пастаўленых перад намі задач зьяўляецца друк у першую чаргу ЦО партыі «Зьвязда».

З сёньняшняга дня мы абвясьцілі кампанію па зборы рацыяналізатарскіх прапаноў У ФОНД ІМЯ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА» і выклікаем іншыя прадпрыемствы пасьледаваць нашаму прыкладу.

Пам. дырэктара па

НАСУСТРАЧ ПАСТАНОВЕ ЦК І СНК—

МАГУТНАЯ ХВАЛЯ САМАКРЫТЫКІ І ВЫТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЬЦІ

Дзесяткі заяў рабочых у партыю і камсамол, сотні новых ударнікаў—на Менскім і Віцебскім вузлох

13 лютага павінна быць скончана рэарганізацыя на Менскім вузле

Пасьля транспартнай нарады пры ЦК на Менскім чыгуначным вузле сур'ёзна ўзяліся за рэарганізацыю апарату з мэтай набліжэньня яго да рабочых мас, да ніжэйшых зьвеньняў вытворчасьці. Пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК была абмеркавана на парт.- і прафактыве Менскага вузла. Актыў жорстка крытыкаваў пастанову работы чыгуначных арганізацый. Пастанова была таксама прапрацавана ў цэхах. Чыгуначнікі добра зразумелі палітычнае значэньне гэтай пастановы і ў адказ на заклік т. т. Сталіна і Молатава 72 старых кваліфікаваных рабочых падалі заявы аб жаданьні ўступіць у партыю. У сваіх заявах яны абяцаюць рашуча змагацца за выкананьне і перавыкананьне транспартнага плану і супроць ухілу ад генэральнай лініі партыі.

На прыкладзе старых рабочых, 99 лепшых ударнікаў чыгуначнай моладзі падалі заявы аб жаданьні ўступіць у камсамол.

Лепшыя прэміяваныя ўдарнікі т. т. ШПІЛЕЎСКІ, ТАРУЛІН, БУРЛО І МУРАШКА рамантуюць паравоз, атрыманы імі для падвойнай язды.

373 чыгуначнікаў ў часе прапрацоўкі пастановы ЦК і СНК абвясьцілі сябе ўдарнікамі. За гэты-ж час узрасла дадатковая падпіска на пазыку «Пяцігодка — за чатыры гады» — на 3.625 руб.

Рэарганізацыя гаспадарчага апарату на Менскім вузле ўжо скончана. Замест ранейшага аднаго кіруючага цэнтру ў маштабе вузла, зараз вызначаны пасады начальніка станцыі, якому падпарадкоўцца эксплёатацыя і камэрцыйныя апараты, начальніка дэпо — выключна па гаспадарцы цяг, начальніка дыстанцыі — па шляхавай гаспадарцы, начальніка памяшканьняў і чыгуначных набудоў (водаправоду і інш.) і начальніка станцыйнай сувязі.

Кожны з гэтых кіраўнікоў нясе поўную адказнасьць за даручаную яму справу. Новая структура гаспадарчых арганізацый дасьць магчымасьць кожнаму кіраўніку цясьней зьвязацца з рабочымі і служачымі і больш уважліва вывучыць «вузкія месцы» данай галіны работы.

Для нагляду за выдаткаваньнем апалу і матар'ялаў і лепшага забесьпячэньня майстэраняў вызначана пасада начальніка апалу і матар'ялаў. Усе гэтыя арганізацыі падпарадкаваны непасрэдна раённаму кіраўніцтву.

Прафарганізацыя таксама зьмяніла свой твар. Станцыйны прафкамітэт ліквідуецца. Замест яго ствараюцца 3 прафкамітэты. Мясцком цяг будзе яднаць 3 праф. цэх. камітэты — паравозных брыгад, дэпо, малога рамонту вагонаў і пэкупаўнаважанага матар'яльнага складу.

Мясцком шляху будзе яднаць два цэхпрафкамітэты — рамонтных рабочых, рабочых дыстанцыі і ўпаўнаважанага сувязі.

Мясцком кандуктарскіх брыгад ахоніць рабочых руху і станцыйных служачых.

Створан самастойны прафкамітэт ФЗУ, які яднае 534 прафкольцы.

Створан адзіны культпалітсавет, які павінен кіраваць усімі клюбамі, чыгуначнымі садамі і стадыёнам Менскага вузла. Прафарганізацыі Менскага вузла будуць падпарадкаваны Аршанскаму вучпрафсаюзу.

Перабудова работы партыйных і прафарганізацый павінна скончыцца да 13 лютага. 13 лютага будзе выбрана бюро вузлавога парткому.

А. М.

Даць адпор дэзарганізатарам транспарту

Першыя крокі да рэарганізацыі на Віцебскім вузле

Прапрацоўка адозвы ЦК і СНК аб рэарганізацыі на чыгунцы ахапіла ўсе арганізацыі Віцебскага вузла. Пытаньне гэта абмяркоўвалася на нарадзе партактыву, куставых сходах партыйных ячэек, на нарадзе сакратароў ячэек і старшынь фабзавкомаў і на цахавых сходах рабочых. Удзельнікі нарад і сходаў упесьлі шмат канкрэтных прапаноў. Зараз рэарганізацыя ідзе поўным ходам.

Паравозныя брыгады прымацоўваюцца да паравозаў. На цягніках № 11 і 12 прымацаваньне ўжо зроблена. Прымацаваньне да паравозаў паасобных машыністаў дало магчымасьць ня толькі ўстаналіць адказнасьць кожнага з іх за цягнік, але і больш зацікавіць іх становішчам паравозу. Зараз машыністы часта наведваюць дэпо, сочаць за рамонтам сваіх паравозаў і дапамагаюць парадамі, чаго раней ня было.

Прыступлена да арганізацыі ТПО, вылучана часовае праўленьне, афармляецца перадача сталовак і магазынаў. На жаль, Віцебскі ЦРК мала дапамагае ў гэтай справе. Значнай перашкодай зьяўляецца таксама адсутнасьць складачных памяшканьняў.

Брыгада паравозьнікаў, распрацоўваючы адозву ЦК і СНК, вылучала 3 асобы для аплаву паравозаў і для нагляду за тым, як ідзе рамонт і г. д. На вузле створана група энэргетыкі для нагляду за эканомным выдаткаваньнем апалу. Прапрацоўка адозвы выклікала рост ударных брыгад і ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы.

Адозва таксама абмеркавана ў камсамольскай арганізацыі. Наладжана некалькі суботнікаў для ліквідацыі прарываў в удзелам моладзі. Па ячэйках №№ 5, 6 і 7 быў арганізаван суботнік па ачыстцы сьнегу з удзелам чырвонаармейцаў падшэфнай часьці.

Аднак, пры прапрацоўцы адозвы мелі месца адзінкавыя выступленьні, якія адбіваюць кастрой найбольш адсталых, невядомых груп работнікаў. Сёй-той прабаваў выступіць за «ўрад'ілаўку». Былі паасобныя галасы за ліквідацыю раённага кіраўніцтва. Інжынар Станцыі алмовіўся перайсьці працаваць інжынэрам на вытворчасьць, некаторыя спецыялісты адмовіліся выехаць на раён, у сувязі з рэарганізацыяй.

Усім гэтым настроям і разважаньням рабочыя на сходах даюць рашучы адпор. Рабочыя заяўляюць, што адозва ЦК і СНК дае магчымасьць наладзіць работу транспарту ў адпаведнасьці з патрабаваньнямі сацыялістычнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі і таму яны патрабуюць ужыць рашучыя меры супроць дэзарганізатараў транспарту.

О. Ш.

Зьнішчыць прастоі вагонаў

Ня гледзячы на напружанае становішча ў перавозцы грузаў на транспарце, усё-ж некаторыя гаспадарчыя арганізацыі дапускаюць агідныя адносіны да выкарыстоўваньня рухомага складу.

Узорным прыкладам можа служыць Саюзтранс, які сыстэматычна недагружае запатрабаваных ім-жа вагонаў.

5-га лютага Саюзтранс патрабаваў 37 вагонаў, з якіх падана было 34. Загружана—24, 7 — недагружана, 3 вагоны зусім не нагружаны.

Есьць выпадкі прастою вагонаў з-за антысанітарнай падачы іх.

6 лютага на каменную рамку паданы для нагрузкі мяса 5 вагонаў: адзін з-пад чорнай вадкасьці і чатыры — з-пад вуталю і вапны. З гэтай прычыны нагрузка затрымалася на паўсуткі.

МАЗ.

Цягнуцца ў хвасьце Гомельскі і Аршанскі вузлы

У ВОРШЫ ДА ПАРАВОЗНАЙ ГАСПАДАРКІ АДНОСЯЦЦА ЗЛАЧЫННА НЯДБАЙНА

На Аршанскім вузле ня ўсё добра

22 РАЗЬБІТЫЯ ПАРАВОЗЫ ЗА СТУДЗЕНЬ СЬВЕДЧАЦЬ АБ ГАНЕБНАЙ РАБОЦЕ СХОДЫ, ПРЫСЬВЕЧАНЫЯ ПРАПРАЦОЎЦЫ ПАСТАНОВЫ ЦК І СНК ЗРЫВАЮЦЦА

Абмеркаваньне і давяданьне да мас адозвы ЦК і СНК аб рабоце транспарту не праводзіцца належнымі тэмпамі. Бюро парткому 30 студзеня прапанавала фракцыі райпрафсаюзу склікаць 1 лютага цэхавыя брыгадныя і зьменныя сходы. Райпрафсаюз правіў нябачаную марудньасьць. Замест цэхавых брыгадных і зьменных складаў, райпрафсаюз склікаў агульныя сходы мясцкомаў—рамонту і пячніковых брыгад разам. Такоўскі сходы ня былі падрыхтаваны, яны сарваліся. Сарваўся агульны сход і па мясцкоме станцыі. А мясцком пуці да гэтага часу правёў толькі адзін цэхавы сход.

Да гэтага часу не наладжан улік сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Прапановы рабочых і вынаходзтвы марынуюцца, як і раней. Трансфіпляц на 1931 год прапрацоўваўся, рабочыя вынужданы сустрачны, але як ён выконваецца ня ведаюць нават парт'ячэйкі і мясцкомы. За сьнежань па мясцкоме цягнікоўых брыгад ня выкананы 24 прапановы рабочых. Колькасьць прапаноў паступова зьмяншаецца. На гэтым-жа мясцкоме за студзень паступіла ўсяго 12 прапаноў.

За апошнюю дэкаду студзеня работа станцыі значна пагоршылася. За дэкаду адпраўлена 108 таварных цягнікоў, з якіх па раскладзе толькі 40, г. зн. 37 проц. Прычыны наступныя: у 35-ці выпадках былі гатовы цягнікі, але не гатовы паравозы, у 29-ці выпадках наадварот—гатовы паравозы, не гатовы цягнікі, а 4 разы цягнікам падавалі неспраўныя паравозы. У 29-ці выпадках цягнікі наогул не атрымалі паравозаў і адпраўленьне цягнікоў адкладвалося.

Адстае нагрузка і выгрузка вагонаў. За дэкаду прыбыло пад выгрузку 1046 вагонаў, выгружана 759. Засталося невыгружаных і непададых да месца выгрузкі 287 вагонаў, у той час, як быў, на поўная магчымасьць іх выгрузіць.

Колькасьць псаваньня паравозаў павялічваецца. За апошнія дні студзеня спалілі адзін пасажырскі паравоз і два таварныя. 9 паравозаў прастаілі ў рамонце на 5-8 лішніх дзён.

Таксама расьце колькасьць апарэшцаў. За сьнежань было ўсяго 33 апарэшці, а за студзень—56, ды яшчэ ў дадатак 40 выпадкаў астановак цягнікоў у пуці для нагону пары. За студзень разьбіта і пераведана 22 паравозы і 23 вагоны. Сутычкі цягнікоў былі 2 разы, выпадкаў псаваньня паравозаў у пуці—10 і г. д.

Гэтыя лічбы прымушаюць біць трывогу. Аб чым яны кажуць? Кажуць аб тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі чыгуначнага вузла станцыі Ворша яшчэ не павярнуліся тварам да вытворчасьці і не перабудавалі сваёй работы.

***

3-ге лютага адбыўся аб'яднаны сход рабочых і ІТР мясцкому рамонту і пячніковых брыгад. Сход адзналіў, што пастанова ЦК УсеКП(б) і СНК накіравана на сапраўдную перабудову работы транспарту. Сход даручыў мясцкому правесьці шырокую работу па заключэньні дагавораў сацспаборніцтва паміж брыгадамі, а таксама стварыць спэцыяльныя брыгады з ліку лепшых рабочых ударнікаў па кантролю за якасьцю рамонту паравозаў.

Адзначаючы кепскае становішча працдысцыпліны, сход прапанаваў ужыць рашучыя меры супроць дэзарганізатараў вытворчасьці і злосных прагулышчыкаў, без гаворачы зьмяючы з працы і выключаючы з саюзу.

Я. Пранаповіч.

„Чыгунка—ня наша справа",—

ТАК АДКАЗВАЮЦЬ ВАРЫСАЎСКІЯ БЮРАКРАТЫ

Да перабудовы работы яшчэ не прыступілі

Работа па барысаўскай чыгуначнай станцыі ў пачатку трэцяга году пяцігодкі зноў перайшла на сыстэму самацёку. Так, за 20 дзён студзеня трансфіплян па звароце вагонаў выканан на 75 проц. Невыканаўшае тлумачыцца прастоем вагонаў, а таксама прастоем цэлых нагружаных цягнікоў з-за нядбайнасьці дзяжурных па станцыі і рэйсных кіраўнікоў. Напрыклад, 25 студзеня на станцыі Барысаў быў падрыхтаваны цягнік для адпраўкі ў Воршу. А калі з Менску прыбыў паравоз, дык яго прышлося адпраўіць у Воршу для рамонту.

Выпадкі нагрузкі лесаматар'ялаў на папсаваныя пляцформы паўтараюцца амаль кожны дзень, прычым папсаваную пляцформу заўважаюць толькі тады, калі яна знаходзіцца ўжо ў складзе цягніка перад адпраўкай.

Станцыя [illegible] недахват рабочай сілы, якая патрэбна для барацьбы са сьнежнымі заносамі. Усе веткі занесены сьнегам, што зрывае работу маневёровых цягнікоў. Ня гледзячы на шматлікія просьбы адміністрацыі станцыі, гарсавет, райвыканком і кіраўніцтва кадрамі не прысылаюць рабочых, адказваючы, што «гэта ня наша справа». Сапраўды барысаўскія арганізацыі не зацікаўлены работай станцыі і зусім адарваны ад жыцьця чыгуначнікаў.

Прагулы за 20 дзён студзеня павялічыліся на 2,2 проц.

Да прапрацоўкі пастановы ЦК і СНК ня прыступлена.

Парткалектыў чыгункі не перабудаваў сваёй работы. Культработы няма ніякай, Клюб, на абсталяваньне якога выкінулі шмат грошай, нічога ня робіць. Насьцянгазэты, ня гледзячы на прарыў, бязьдзейнічаюць. Загадчык клюбу Музыка разам з членамі грутка п'яніствуе ў памяшканьні клюбу. Бюро парткалектыву аб гэтым ведае, але мер ня прымае.

Трэба рашуча ўзадраўіць работу на станцыі Барысаў, вызваліўшы станцыю ад апартуністычных элемэнтаў.

Рабкор Барысаўскі.

Пастанова Наркамправы СССР марудна рэалізуецца

Пастанова Наркамправы СССР ад 16 студзеня 1931 году аб звароце на работу на транспарт асоб, якія раней працавалі на чыгунцы, для большай колькасьці ўстаноў гор. МЕНСКУ засталася пустым гукам.

Да сёньняшняга дня сьпіс асоб, раней працаваўшых на транспарце, падалі ў Наркамправы БССР толькі 28 УСТАНОЎ і ПРАДПРЫЕМСТВАЎ. ІНШЫЯ НІЯКІХ ВЕСТАК НЯ ЯРЫСЛАЛІ. Гэтыя ўстановы нават ня лічылі патрэбным паведаміць Наркамправы, ці ёсьць у іх установах і прадпрыемствах, асобы якія раней працавалі на чыгунцы.

ЯШЧЭ БОЛЬШ АБУРАЮЧЫМ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА ТОЙ ФАКТ, ШТО НЯ ЎСЕ НАЧАЛЬНІКІ РАЁННЫХ ВУЗЛОЎ ДА ГЭТАГА ЧАСУ ДАЛІ ЗАЯЎКУ НАРКАМПРАЦЫ НА ПАТРЭБНУЮ КОЛЬКАСЬЦЬ РАБОЧЫХ ЧЫГУНАЧНІКАЎ ПА АСОБНЫХ КВАЛІФІКАЦЫЯХ.

Гэтыя факты яркa гавораць аб тым, што з боку вялікай колькасьці ўстаноў і прадпрыемстваў, а таксама кіруючых чыгуначна - транспартных арганізацый яшчэ ня ўлічана вялізарнае значэньне чыгуначнага транспарту, як асноўнай галіны нашай сацыялістычнай гаспадаркі.

Вінаватыя ў зрыве пастановы Наркамправы СССР павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

З—ы.

ПАБУДУЕМ САВЕЦКІЯ ДЫРЫЖАБЛІ

— Аўтры памантару «Наша камуна» Сіруук М. і Вінаградаў З. уносяць з аўтарскага гаданарару, які ім належыць, на набудову дырыжабля імя «Праўды» 500 руб. і на ліквідацыю пісьменнасьці 1.000 руб.

Грошы пераліваны Беллазяржвыдавецтвам на рахунак паказаных арганізацый.

— Парткалектыў БСІКО уносіць 21 руб. 26 кап., заробленых групай партыйцаў парткалектыву на выгрузцы вагонаў, на набудову дырыжабля імя «Праўды».

Парткалектыў выкінае ўсіх партыйцаў-чыгуначнікаў Менскага вузла.

— Рабочыя і служачыя Аршанскага вучпрасаюзу сабралі на набудову дырыжабля «Клім Варашылаў» 53 р. 60 к.

— Супрацоўнікі БДВ уносяць на набудову дырыжабля імя «Праўды» 376 р. 50 к. і выключаюць аддзяленьне «ГИЗ'у» РСФСР.

— Бешынкаўскі райпрафсаюз уносіць у фонд дырыжаблябудаўніцтва 22 р. 10 к.

— Грамадзянка Герулева Ганна ўносіць свой гадавы заробак у сумме 1 р. 50 к. у фонд абароны краіны і выключае ўсіх рабсельпоўцаў пасьведчаньні з прыкладу.

— У адказ на выклікі інтэрвентаў група каморнікаў Гербачэва рэйса ўносіць дадатково 21 руб. на набудову дырыжабля імя «Праўды» і выкінае мясцком ГВК у Гернах.

— У адказ на шкодніцтва і вярадніцтва розных Рамзэнаў, Ларшэнных і беларускіх контрэвалюцыянераў надпісаў, у адказ на падрыхтоўку ваеннай інтэрвэнцыі супроць СССР,—каморнікі і аграномы Шыпоўскага раёну — у колькасьці 14 асоб—уносяць 77 руб. на набудову дырыжабля «Клім Варашылаў» і выкінаюць каморнікоў і аграномаў, Матлеўскага, Лупелаўскага, Круглянскага, Гарацкага, Капыльскага, Бялыніцкага і Аршанскага раёнаў.

Не лепш, а горш

АРГАНІЗАЦЫІ ГОМЕЛЬСКАГА ВУЗЛА НЕ СЬПЯШАЮЦЦА ПЕРАБУДОВАЙ РАБОТЫ

6 лютага закончылася першая партканфэрэнцыя Гомельскага вузла. З дакладу начальніка эксплёатацыйнага раёну тав. Міхайлава канфэрэнцыя даведалася аб даволі ганебным становішчы работы вузла. Вузел не спраўляецца з работай. Напрыклад, на 3 лютага кліентура дала заяўкі на 1.086 вагонаў, а раён мог даць толькі 312. Такім чынам, заяўкі ня выкананы на 774 вагоны. Чым гэта тлумачыць? Па словах дакладчыка, гэта тлумачыцца выключна непаваротлівасьцю, адсутнасьцю адказнасьці за даручаную справу няправільным разьмеркаваньнем рабочай сілы і заняпадам працдысцыпліны.

— Мы часта ня выконваем дырэктыў і пастаноў партыі, а імкнёмся ўскласьці віну на «аб'ектыўныя» прычыны, чым праўдзіваем правы ўхіл на практыцы,—кажа дакладчык.

Паасобныя камуністы ня толькі не стаяць на чале рабочых, але плятуцца ў хвасьце адсталай часткі. Яны не змагаюцца з парушэньнямі працдысцыпліны і тымі, хто зрывае транфіплян. У довад гэтага тав. Міхайлаў падаў рад фактаў.

Па дакладу выказаліся 32 таварышы, якія таксама выкрылі шмат недахопаў у рабоце раёну.

Сакратар цэхпарт'ячэйкі паравозьнікаў т. Харук заявіў, што дырэктыва аб звароце чыгуначнікаў на транспарт ня выконваецца. Гаркому партыі і парткому вузла трэба зьвярнуць увагу на прарыў у дэпо з якога яно ня вылазіць ужо некалькі месяцаў.

Тав. Панкратаў пацьвердзіў, што многія парт. і прафарганізацыі на мясцох зусім ня цікавяцца хутчэйшым зваротам машынэтаў і іх памочнікаў на транспарт. З 226-ці чалавек на транспарт да гэтага часу вярнулася толькі, 14, некаторыя гарадзкія арганізацыі імкнуцца даць транспарту толькі тых людзей, якія для іх саміх не падыходзяць. А вось вылучэнец-партыец Жарын Іван, залуляе—«Як я пайду на транспарт, калі гэтым паменшыцца мой заработак, лепш я зусім звольнюся». Такіх работнікаў трэба асудзіць самым рашучым чынам.

Начальнік аддзелу эксплёатацыі тав. Пікульскі паведаміў, што процант хворых паравозаў вырас ад 6 да 12 і нават да 13. Спазьненьне цягнікоў стала звычайным зьявішчам. У вагонах пасажырскіх цягнікоў панує антысанітарыя. Ніхто на гэта не зварачае ўвагі. Кліентуру, кажа тав. Пікульскі, мы за прастой вагонаў аддаем пад суд, а вось дарожных агентаў (майстраў), якія дапускаюць прастоі вагонаў паданых пад выгрузку сьнегу, мы ня хочам.

— Вышэйшая адміністрацыя яе ніжэйшую,—кажа токар дэпо тав. Платонаў, а між тым, часта ніякага кіраўніцтва, апрача папяровага, вытворчасьць ня мае. У дэпо зараз працуе каля 70 проц. некваліфікаваных сьлясараў, якія мала клапоцяцца аб якасьці рамонту цягнікоў, а імкнуцца толькі трапіць хутчэй на паравоз.

Дэлегаты канфэрэнцыі прабілі правільны вывад, што ня транспарт хворы, а самі работнікі. Як у нас, напрыклад, справа з ударніцтвам і сацспаборніцтвам? Колькі ў нас камуністаў-ударнікаў? Некаторыя лічаць, што калі ён камуніст, дык значыцца—ударнік і залісвацца ва ўдарную брыгаду ня лічыць патрэбным. Адзначаліся ў цэхах няма, пануе хвасьцізм, бо адміністрацыя не жадае псаваць адносін з падначаленымі.

Трэба неадкладна ўзяцца за перабудову парт. і прафработы, перанесьці цэнтр работы ў цэхі і брыгады. Трэба выканаць пастановы партыі не на словах, а на справе.

Брыгада.

На Гомельскай чыгунцы вынаходзтва не ў пашане

Суд над глушыцелямі рабочай ініцыятывы сарваны па віне прафарганізацыі

Пакончыць са зьдзекамі з рабочых прапаноў

На Гомельскім вузле наглядаецца шкодная недаацэнка рацыяналізацыі і вынаходзтва, што зьяўляецца вялікім тормазам рэканструкцыі транспарту.

Прапанова сьпесара дэпо тав. ЛУК'ЯНАВА аб шарошцы для фраэзэроўкі гнёзд была ўнесена яшчэ ў 1926 г., але кявыканана па віне майстроў КУЗЬМІНА, ТЭНГЕРА і ВАРУШЧЫНКА, у той час, як на выраб прылады патрабуецца ўсяго 6 дзён і адна гадзіна для выпрабаваньня яе.

Прапанова машыніста МАШАСТАГА — прылада для праверкі конусаў інжэктара — ня выконваецца на працягу паўтара года. Мадэль гэтай прылады ўвесь час праляжала на вакне майстра дэпо станцыі Гомель.

Каштоўная прапанова машыніста БАРАНОВІЧА — камбінаванае трубнае злучэньне паравозу з магістраллю пры гарачай промыўцы, ня гледзячы на яе вялікае значэньне, марынуецца вось ужо тры месяцы з-за нядбайнасьці майстра ВАРЭНКА.

Апрача таго, шмат каштоўных прапаноў і вынаходзтваў ухвалены адміністрацыяй, але не ажыцьцяўляюцца. У стапе загадчыка рамонтам ГАЛАВАЧА знойдзена 15 чарцяжоў вынаходзтваў, да выробу якіх не прыступілі.

Рабочая прапанова на Гомельскім вузле павінна прайсьці вялікі бюракратычны шлях. У раённай камісіі дзейнасьці прапанова ў сярэднім пляжыць 10 дзён, у «Дорвузпе» — 23 дзён, на выпрабаваньні прапанова знаходзіцца ў сярэднім 65 дзён, на выраб тэй ці іншай дэталі — 16 дзён і г. д. Гэты «карантын» павінна прайсьці кожная рабочая прапанова, нават самая тэрміновая.

Зусім недапушчальным зьяўляецца становішча з прэміяваньнем вынаходцаў і рабочых. З фонду ў 8.000 руб. на дадаткавана толькі 802 руб., а з прэміяльнага фонду ў 8.355 руб. выдаткавана толькі 1.462 руб.

Яшчэ горш стаіць справа з падлікам эканамічнага эфэкту ад рабочых прапаноў. Адна прапанова так доўга хадзіла па інстанцыях, што згубіла свайго аўтара.

Становішча з вынаходзтвам і рабочымі прапановамі на Гомельскім вузле трывожнае. Сплікаваны гэтымі днямі зьлёт вынаходцаў раёну прайшоў вельмі нездавальняюча. [illegible] паходцаў зьявілася [illegible] у правёў ніякай [illegible] пціколу. На зьлёце ня [illegible] артакалекніка, нікога н[illegible] пазьніліся ячэек. І калі [illegible] ніне культ-находцы ў [illegible] дилектантыны каб усе аб[illegible] людзей да чых пра[illegible] 10, 11, 12 і 13 суд. [illegible] альную вул. у [illegible] сямітоўкі (2-гі [illegible] агадчыка шко-

ТАВ. АЛЯШКЕВІЧ — ударнік ... ударнік-вынаходца. Апош[illegible] ходства — аўтаматычн[illegible] 2 і [illegible] наў, якая палягчае і па[illegible]

мі нездавальняюча [illegible] паходцаў зьявілася [illegible] у правёў ніякай [illegible] пціколу. На зьлёце ня [illegible] артакалекніка, нікога н[illegible] пазьніліся ячэек. І калі [illegible] ніне культ-находцы ў [illegible] дилектантыны каб усе аб[illegible] людзей да чых пра[illegible] 10, 11, 12 і 13 суд. [illegible] альную вул. у [illegible] сямітоўкі (2-гі [illegible] агадчыка шко-

[illegible] ставуся [illegible] чыў значэньня суда і не мэбілізаваў увагі рабочых. Таму на суд зьявіліся толькі абвінавачаныя і сьведкі і ні аднаго рабочага. Гэта прымусіла суд адкласьці разгляд справы на пару дзён.

Трэба прыцягнуць да адказнасьці некаторых кіраўнікоў, вінаватых у прымірэнчых адносінах да апартуністычнай недаацэнкі значэньня рацыяналізацыі і вынаходзтва.

Б. ЗЭЛЬМАНАЎ.

20 вымоў у кожным загадзе

Віцебская акулярная фабрыка пачала трэці год пяцігодкі з невыкананьня прамфінпляну. Калі ў 1930 г. «трыкутнік» апраўдваўся недахватам энэргіі, дык у гэтым годзе першая БелДРЭС без затрыманьня забясьпечвае фабрыку энэргіяй. Матар'ялам фабрыка забясьпечваецца таксама здавальняюча і прамфінплян яна можа поўнасьцю выканаць. Але за першыя дзьве дэкады студзеня фабрыка праграмы ня выканала. Ня выканала фабрыка праграмы і за пятую пяцідзнеўку (87,72 проц.). Зборачна-аптычны цэх выканаў праграму толькі на 47,91 проц., ня гледзячы на тое, што цэх гэты поўнасьцю забясьпечан поўфабрыкатамі, матар'ялямі і інш.

Прарыў тлумачыцца тым, што на фабрыцы назіраюцца вялікія ПРАГУЛЫ, СПАЗЬНЕНЬНІ І ЗАНЯПАД ПРАЦДЫСЦЫПЛІНЫ. Адміністрацыя дае па 20 вымоў у кожным загадзе, прычым гэта мера ўжо ня дзейнічае. Калі на сходзе рабочых мэханічнага цэху было пастаўлена пытаньне аб выключэньні з саюзу злосных прагульшчыкаў, нават некаторыя партыйцы ўстрымаліся ад галасаваньня.

Абноўлены «трыкутнік» разгортвае работу вельмі марудна.

ЛЯБОРО.

Якасьць будаўніцтва—дрэнная

СЬМІЛАВІЧЫ. У дагаворы, заключаны паміж Белсельбудам і Сьвінаводам на будаўніцтва сьвінарнікаў, ёсьць шмат недарэчнасьцей і няўвязак якія перашкаджаюць разгортванню будаўніцтва і выкананьню намечаных пляноў. У дагаворы не паказаны тэрміны выкананьня работы, а таксама і якасныя паказальнікі. Вось прыклад, у саўгасе «Горкі-Абчак» у двох пабудаваных сьвінарніках няма вэнтыляцыі і ваганэтак для развозкі кармоў. У адным сьвінарніку кармушкі вельмі малыя. Праходы паміж імі вузкія, што не дае магчымасьці падаваць корм сьвіньням.

Тэхнічны нагляд на будаўніцтве быў вельмі дрэнны. Ня гледзячы на раз указаньняў з боку РСІ, дагаворы не па будавана студня, вэнтыляцыя і г. д.

Трэба рашуча ўдарыць па такіх горадбудаўнікох і галавацяпах.

РАБІНАК.

Тэхнічную дапамогу—рабочым-рацыяналізатарам

Прамысловасьць ВСНГБ за апошні пяцігадзьдзь мае значныя дасягненьні ў справе рацыяналізацыі. Рабочая грамадзкасьць адгукнулася на адозву ЦК УсеКП(б) аб масавым вынаходзтве падачай вялікай колькасьці рабочых прапаноў пры абмеркаваньні сустрачных прамфінпляну. Весткі з большасьці прадпрыемстваў кажуць аб тым, што рацыяналізацыя пачынае ўсё больш заваёўваць ганаровае месца на фабрыках і заводах.

Падамо некалькі прыкладаў. Адзін з найбольш важных задач у галіне рацыяналізацыі зьяўляецца рацыяналізацыя энэргагаспадаркі. Як вядома, выкарыстаньне адпрацаванага цяпла і прымусны камбінаваны выпрацоўкі цяпла і пары маюць вялізарнае значэньне. На гарбарні «Бальшэвік» у мінулым годзе ўведзена поўнае скарыстаньне адпрацаванай пары лёкамабільных установак для вытворчых мэт, што дае каля 30.000 руб. эканоміі ў год.

Запалкавая фабрыка «Чырвоная Бярэзіна» ў мінулым годзе таксама пачала скарыстоўваць адпрацаваную пару электрастанцыі для вытворчых мэт, што дае эканоміі каля 40.000 руб. у год.

Значныя зьмены зроблены ў топках, якія часта зьяўляюцца крыніцамі страты цяпла. Тыя прадпрыемствы, якія працавалі на вугалі, былі пераведзены на паветрана - дуцьцявыя топкі, што ў межах БССР забясьпечыла эканомію каля 130.000 руб. у год. У радзе вынадкаў топкі былі пераведзены на больш нізкагатунковы вугаль і антрацыт. У прыватнасьці цагельні былі пераведзены на антрацытавы штыб, што дало 40-50 тыс. руб. эканоміі ў год.

У галіне рацыяналізацыі скарыстаньня адкідаў трэба адзначыць посьпехі электрастанцыі імя Леніна ў Барысаве, якая наладзіла эканамічнае спальваньне дробных дрэўляных адкідаў.

З ліку канкрэтных рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, ажыцьцёўленых на паасобных фабрыках і заводах на працягу апошніх двух год, варта паказаць на наступнае.

На Шкловаб'яднаньні: устаноўка газавых кукшак на заводах «Камінтэрн» і імя Домбаля, дзякуючы якім удалося лепш скарыстаць вапністы пескі і павялічыць выраб на 10-15 проц. Насуп на Шкловаб'яднаньні рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў за 1928-29 год далі 200 тыс. руб. эканоміі, што прыпадае зьніжэньне сабекошту прадукцыі на 3,3%, а за 1929-30 г. — [illegible] тыс. руб. эканоміі, што складае 2% зьніжэньня сабекошту.

На Тэкстыльаб'яднаньні: увядзеньне ў мінулым годзе на фабрыцы «Дзьвіна» дуцьцявых топак, упрашчэньне работы дня і мэханізацыя ўпакоўкі дало на гэтай фабрыцы 161 тыс. руб. эканоміі. На фабрыцы імя Карла Маркса пачаты шэньне ў справе скарыстаньня сыпцу і ўпрашчэньня работы дня дало 75.000 руб. эканоміі.

На Папераб'яднаньні 70 рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў далі эканоміі 174.000 руб., що складае 3% зьніжэньня сабекошту. На Будаб'яднаньні зьніжэньне сабекошту за 1928-29 год за лік рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў складае 5,25%. На Мэталяаб'яднаньні раймерапрыемствы ў мінулым годзе далі 516.000 руб. эканоміі або 3,4% зьніжэньня сабекошту. На Шклаб'яднаньні рацыяналізацыі ў карыстаньні лекалаў для кройкі дала больш 1 млн. руб. эканоміі.

Такім чынам, рацыяналізацыі прыносіць вялізарную эканомію нашай прамысловасьці і спрыяе значнаму зьніжэньню сабекошту прадукцыі. Таму кіраўнікі ўсіх фабрык і заводаў, а таксама заводзкія арганізацыі павінны зьвярнуць максімум увагі на пытаньні рацыяналізацыі.

Асабліва вялікую увагу трэба зьвярнуць на прапановы рабочых, бо рацыяналізатарскія прапановы рабочых складаюць значную частку ўсёй колькасьці рацпрапаноў.

На жаль, трэба адзначыць, што ў справе скарыстаньня рабочых прапаноў ёсьць яшчэ шмат недахопаў. Асноўная перашкода на гэтым шляху зьяўляецца кепськастарэльная тэхнічная дапамога рабочым як тэхнічнай распрацоўкай і абгрунтаваньнем прапаноў, так і стварэньнем патрэбных умоў для росту рацыяналізатарскага руху.

Месячнік рацыяналізацыі, які зараз у нас праводзіцца, павінен стварыць пералом у рацыяналізатарскай рабоце. Рабочыя прапановы і вынаходзтвы павінны стаць магутным тарэнам будаўніцтва сацыялізму, павінны дасягнуць нашай прамысловасьці вызваліць ад замежнай залежнасьці.

БОЛЬКЕНШТЭЙН.

Да другога ўсебеларускага зьезду Асоавіяхіму

Ад першага зьезду да другога прайшло 2 гады і 8 месяцаў. За гэты час ваенная небясьпека нападу на Савецкі Саюз ня зьменшылася, а павялічылася.

Апошнія жэнэўскія інтрыгі накоп стварэньня еўрапейскай федэрацыі народаў, абвінаўні камандаваньня польскай і румынскай армійм у руках французкага генэральнага штабу, агляды беластвардзейскіх сіл—а ўсё выразнасьцю гавораць аб шалёнай падрыхтоўцы імперыялістаў да ўзброенага нападу на адзіную ў сьвеце пралетарскую дзяржаву.

Акрамя гэтага, посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва СССР яшчэ больш узмацняюць злосьць імпэрыялістычнага акружэньня.

Гэта ліхаманкавая падрыхтоўка сусьветнага імпэрыялізму, на чале з Францыяй, да інтэрвэнцыі супроць СССР, якая знаходзіць унутры нашай краіны дапамогу ў асобе кулацтва, шкодніцкай часткі буржуазных спэцыялістаў, а таксама ў нас у БССР у асобе контр-рэвалюцыйнай дзейнасьці беларускіх нац.-дэмаў, патрабуе ад усіх працоўных і ў першую чаргу ад нашага таварыства згрупаваньня ўсіх сіл вакол кампартыі, вакол вызначаных бо задач абароны краіны.

Арганізацыі Асоавіяхіму прымалі непасрэдны ўдзел у радзе важнейшых палітычных кампаній, якія праводзіла партыя і савецкая ўлада.

Канфэрэнцыі таварыства прайшлі пад знакам вялізарнейшай актыўнасьці і згуртаваньня нашага таварыства вакол КП(б)Б, для выкананьня ўсіх намячэньняў генэральнай лініі партыі, для яшчэ большага згуртаваньня сіл на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны Саветаў.

Вялізарнейшы ўздым энтузіязму працоўных мас, іх жаданьне прыняць непасрэдны ўдзел у справе ўмацаваньня абароназдольнасьці краіны, далі вялізарны рост нашай арганізацыі.

На БССР ёсьць звыш 300.000 членаў Асоавіяхіму, што азначае рост ад першага зьезду да другога больш чым у два разы.

Трэба адзначыць, што дзейнасьць беларускай арганізацыі, як і ўсёй арганізацыі Асоавіяхіму Савецкага Саюзу, праходзіла па дзьвох лініях: па лініі дзейнасьці ўзмацненьню абароназдольнасьці краіны і па

1.850 ЧЫРВОНЫХ КАМАНДЗІРАЎ—

СТОЙКІХ БАРАЦЬБІТОЎ ЗА СПРАВУ ПЕРАМОГІ САЦЫЯЛІЗМУ—ДАЛА КРАІНЕ САВЕТАЎ АБВШ ЗА ДЗЕСЯЦЬ ГОД СВАЙГО ІСНАВАНЬНЯ

НЯХАЙ ШКОЛА, якая зьяўляецца праваднікам ленінскай нацыянальнай палітыкі—выхоўвае, загартоўвае і вучыць тысячы байцоў-камандзіраў для перамогі сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі

НЯХАЙ ШКОЛА кожны дзень і кожную гадзіну ўмацоўвае баявую магутнасьць Чырвонай арміі

На мяжы адзінаццатага

Пралетарыят, разбурыўшы стары парадак, захапіўшы ўладу, няўхільна арганізуецца ў дзяржаву, а значыцца арганізуецца і ваенна. Канкрэтнай формай ваеннай арганізацыі пралетарыяту і працоўных бядняцка-серадняцкіх мас сялянства, якімі ён кіруе, зьяўляецца Чырвоная армія.

Наша Чырвоная армія зьяўляецца перш за ўсё ўзброенай сілай для хутчэйшага падаўленьня эксплёататараў, для забесьпячэньня будаўніцтва сацыялізму, для абароны бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту. Але-ж задачы Чырвонай арміі гэтым ня вычэрпваюцца. Наша армія ня ёсьць армія працоўных адной толькі краіны, як і справа сацыялістычнага будаўніцтва БССР не зьяўляецца толькі справай працоўных СССР. Сацыялістычнае будаўніцтво ў СССР накіравана да стварэньня матар'яльнай базы для сусьветнай камуністычнай рэвалюцыі, а Чырвоная армія — ёсьць армія гэтай рэвалюцыі.

Армія пралетарыяту ня толькі зброя [illegible] і абароны. Наша армія, да ўсяго гэтага, зьяўляецца яшчэ адной з [illegible] апозіцыі пралетарыяту і сялянства, [illegible] баявы саюз рабочае клясы і сяля[illegible]. Чырвоная армія да таго-ж [illegible] яшчэнай культурнай сі[illegible] ваторыяй, дзе ў масавым маш[illegible] абляецца чалавечы матар'ял [illegible] задачам камуністычнай рэ[illegible]

Тэм[illegible] і пі[illegible] ніць пар[illegible]ьць дзяржава аднэй стакова[illegible]ыянальнасьці, а зьяўдомена[illegible]цоўных розных на[illegible]натуральна, што па[illegible] арміі, якая зьяўляе[illegible] формай саюзу працоўных розных нацыянальнасьцей, павінна адпавядаць прыродзе і задачам Саюзу ССР.

XII зьезд камуністычнай партыі, даючы канкрэтныя дырэктывы па стварэньні СССР, не абмінуў і пытаньняў будаўніцтва баявой сілы Саюзу. Зьезд даў дырэктыву партыі, каб «была усилена воспитательная работа в Красной армии в духе насаждения идей братства и солидарности народов Союза, и были предприняты практические мероприятия по организации национальных войсковых частей, с соблюдением всех мер, необходимых для обеспечения полной обороноспособности Республики». Гэта значыць, што неабходна прыцягнуць для абароны краіны працоўных усіх нацый.

Канкрэтнай формай гэтага зьяўляецца фармаваньне нацыянальных часьцей Чырвонай арміі. Нацыянальныя фармаваньні па сутнасьці сваёй і азначаюць, што працоўныя ўсіх нацыянальнасьцей прыцягнуты да справы абароны сацыялістычнай бацькаўшчыны. Нацыянальныя фармаваньні пішні раз даводзяць, што Чырвоная армія не аддзяліма ад працоўных мас, пішні раз даводзяць яе інтэрнацыянальны характар. А ўсё гэта ў сваю чаргу азначае дадатковую сілу Чырвонай арміі, — армії пралетарыяту.

У першыя дні рэвалюцыі ня было магчымасьці прыступіць да фармаваньня нацыянальных часьцей таму, што для гэтага ня было адпаведных умоў. У працэсе грамадзянскай вайны стыхійна ўзьнікалі асобныя атрады нацыянальных войск, якія нярэдка паказвалі ўзоры гэрэізму.

Пасьляховае вырашэньне нацыянальнага пытаньня на аснове правільнай ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі, гаспадарчы і культурны рост народаў СССР, якія ў мінулым знаходзіліся пад падвойным прэсам сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня, зьявілі фактычнай няроўнасьці працоўных розных нацыянальнасьцей СССР,—зьявілася базай для стварэньня нацыянальных часьцей для далейшага ўзмацненьня абароназдольнасьці СССР. Нацыянальная фармаванькі—ёсьць неадлучная частка нацыянальнай палітыкі партыі. «ТОЛЬКО В УСЛОВИЯХ ПОЛНОГО НАЦИОНАЛЬНОГО РАВЕНСТВА и национальной политики Советского правительства стало возможным осуществить неразрешимый для царизма и для капиталистических стран ВОПРОС О ПРИВЛЕЧЕНИИ ВСЕХ НАРОДОВ К СТРОИТЕЛЬСТВУ ВООРУЖЕННЫХ СИЛ СТРАНЫ». (Ворошилов).

Беларусь —краіна, насельніцтва якой у сваім мінулым прыцягвалася на вайсковую службу, а рэвалюцыя і грамадзянская вайна ўтварыла, хоць і колькасна нязначныя кадры камандзіраў і палітычнага складу. Аднак, для стварэньня беларускіх часьцей гэтага складу было мала. І пры тым ён у БОЛЬШАСЬЦІ СВАЁЙ БЫЎ русіфікаваны. Адсюль вынікла выключнай важнасьці задача: стварэньне новых кадраў камандна-палітычнага складу з рабочых і бядняцкіх мас КАРЭННАГА НАСЕЛЬНІЦТВА.

Шляхі практычнага вырашэньня гэтай важнейшай ЗАДАЧЫ ЗНОЙДЗЕНЫ ў стварэньні вайсковых школ.

АБВШ вырасла з кароткатэрміновых курсаў па падрыхтоўцы камандзіраў складу. Рэарганізацыя курсаў у школы, рост і посьпехі АБВШ адбіваюць рост баявой магутнасьці рабочае клясы на аснове росту сацыялістычнага будаўніцтва.

За 10 год свайго існаваньня школа мае вялізарныя дасягненьні, якімі Чырвоная Армія можа ганарыцца.

За 10 год свайго існаваньня, за 10 год упартай работы над часта малапісьменным людзкім матар'ялам, школа ўліла ў рады Чырвонай Арміі 1.850 камандзіраў. Шмат якія з іх прайшлі ўжо сваё першае «боевое крещение», ліквідуючы белыя банды.

Партыя паставіла задачай перад вайсковымі навучальнымі ўстановамі, каб камандзір, які выпускаецца з гэтых устаноў, адпавядаў па сваёй падрыхтоўцы сучасным умовам вядзеньня і кіраўніцтва боем. Гэта задача вызначае зьмест работы школы па падрыхтоўцы камандзіраў.

Выкананьне гэтай задачы, гэтых канкрэтных патрабаваньняў, якія прад'яўляе партыя і рабочая клясa да школы, можа быць ілюстравана вынікамі. У 1930 годзе школа па сваёй тактычнай і стратэгічнай падрыхтоўцы заняла першае месца ў Беларускай Вайсковай Акрузе, а на Усесаюзных спаборніцтвах другое месца ў РСЧА.

Гэтых сваіх посьпехаў школа дасягнула на аснове ўдарнай работы мэтадамі сацыялістычнага будаўніцтва: сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва, на аснове шырэйшай актыўнасьці курсанцкай масы і начальніцкага складу, на аснове гэрэічнай адданасьці курсантаў і камандзіраў рабочай класс.

Школа зараз занята вырашэньнем складаных задач, якія стаяць перад Чырвонай Арміяй: аўладаньнем складанымі формамі бою, аўладаньнем новай тэхнікай, якой аснашчаецца наша Чырвоная Армія. Камуністычная партыя, рабочая кляса, працоўныя масы Савецкай Беларусі і Саюзу ССР могуць быць упэўнены, што іх школа з гэтымі задачамі справяцца.

Пад кіраўніцтвам ленінскай партыі мэтадамі сацыялістычнага будаўніцтва усе нашы недахопы будуць ліквідаваны. І калі наша партыя, савецкі ўрад дадуць загад Чырвонай арміі выканаць свой інтэрнацыянальны абавязак, камандзіры, якія выпушчаны нашай школай, ня будуць апошнімі.

Я. ВАСІЛЕВІЧ.

Курсант аб сваёй школе

Маё вялікае жаданьне здбылося. У «кузьню» чырвоных камандзіраў папаў і я. Гэта жаданьне цесна зьвязала мяне са школай, бо тут добра, вельмі добра. Гэта «кузьня» паказвае далейшы шлях жыцьця, змаганьня за справу Кастрычніка. Яна выкоўвае моцных, здольных палітычна байцоў, якія ня толькі гатовы абараняць межы Савецкага Саюзу, але і змагацца за сацыялізм.

Мы жывем тым, чым жыве наша камуністычная партыя. Мы трымаем цесную сувязь з рабочымі, з вёскай. Мы свой адпачынак скарыстоўваем для таго, каб растлумачыць сялянству задачы сацыялістычнага будаўніцтва. Адзінай сям'ёй мы згуртаваны вакол ленінскай партыі. Пад лёзунгамі сацспаборніцтва, камуністычнае працы мы носім назву ўдарнікаў-курсантаў. Узмацняючы баявую падрыхтоўку, мы мабілізуемся і мабілізуем свае вольныя сродкі на выкананьне пяцігодкі за чатыры гады. Мы пільна сочым за міжнародным становішчам, прыслухоўваючыся да кожнага кроку інтэрвэнтаў і капіталістаў. Гатоўнасьць наша ў хвілінах, каб стаць на абарону бацькаўшчыны — Савецкага Саюзу.

Курсант АБВШ — АСТАПЕНКА.

Партарганізацыя школы на шляху выкананьня патрабаваньняў РВС

10 год школы — дзесяць год упартай работы партарганізацыі. З сотнямі выпушчаных камандзіраў Чырвонай арміі партарганізацыя дала і сотні новых байцоў партыі. Налічваючы ў сваіх радох дзесяткі, партарганізацыя ў сваім колькаснымі ідэйным росьце, ва ўмовах зьменнага складу прышла да 10-й гадавіны колькасна вялікай, ідэйна непамерна ўзросшай і бальшавіцкі згуртаванай, прышла хаця і маладым, але моцным атрадам партыі ў барацьбе за яе гэнэральную ленінскую лінію.

Партарганізацыя вяла барацьбу за ідэйную чыстату сваіх радоў, даючы рашучыя баі канкрэтным праявам контр-рэвалюцыйнага трацкізму і правага апартунізму ў сваіх радох як па агульных пытаньнях партыйнай палітыкі, так і па пытаньнях баявой падрыхтоўкі. Былі і памылкі, але гэтыя памылкі выкрываліся і з уласьцівай бальшавікам рашучасьцю выпраўлялі-ся.

У барацьбе з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай на даным этапе, беларускім контр-рэвалюцыйным нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі розных колераў, партарганізацыя паступова і настойліва ажыцьцяўляла ленінскую нацыянальную палітыку партыі ў нацыянальнай школе. У выніку — вялізныя посьпехі: пераход большасьці дысцыплін на беларускую мову, пераход партыйна-палітычнай работы выключна на беларускую мову, значны рост ліку беларусаў у складзе школы.

Зрабіўшы рашучы паваро́т тварам да баявой падрыхтоўкі (праўда, яшчэ далёка няпоўны) партарганізацыя стала на чале ўзросшай актыўнасьці мас, стала на чале новых форм праяўленьня гэтай актыўнасьці, разгортваючы сац. спаборніцтва і ўдарніцтва, арганізуючы ўдарныя брыгады, грамадзкі буксір, праводзячы дэкаду прананоў. Яна павышала патрабаваньні да камуністаў і дабівалася лепшых паказальнікаў у баявой падрыхтоўцы, займаючы вядучую ролю (лепшае выкананьне стральбы, 58,5 проц. партыйцаў у камандзе спайнэраў).

Партарганізацыя рашуча змагалася за ўзмацненьне рэвалюцыйнай дысцыпліны і здаровае палітыка-маральнае становішча школы і мае ў гэтым вялікія посьпехі.

Паказальнікам таго, што партарганізацыя здолела згуртаваць вакол сябе склад школы, зьяўляецца вялікая цяга ў партыю (падана 150 заяў, прынята 115).

Уступаючы ў 11 год работы, партарганізацыя мэтадам бальшавіцкай самакрытыкі, зьнішчаючы шмат якія недахопы ў сваёй рабоце, павінна накіраваць усе сілы і калектыўную волю да далейшага ўзмацненьня і росту сваіх радоў, завяршыць свой канчатковы паваро́т тварам да баявой падрыхтоўкі і гэтым забясьпечыць поўнае выкананьне патрабаваньняў РВС на 1931 навучальны год.

Казлоўскі.



Вывучаюць дальнамер

ЗАГАД ВОЙСКАМ БВА

5 лютага 1931 г.

№ 15

гор. Смаленск

5 лютага 1931 году споўнілася 10 год існаваньня Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы імя Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР.

Школа сфармавалася з 2-х маскоўскіх пяхотных курсаў, перайменаваных потым у 81-п менскія пяхотныя курсы імя СНК БССР. Па меры ўзмацненьня саветаў і разгортваньня мірнага будаўніцтва, 6 красавіка 1924 г. загадам РВС СССР № 326/65 1924 г., 81-п менскія пяхотныя курсы пераймянёўваюцца ў Аб'яднаную Беларускую Школу імя ЦВК БССР.

Аб'яднаная Беларуская Вайсковая Школа за 10 год упартай работы выпусьціла ў рады рабоча-сялянскай Чырвонай арміі 1.850 камандзіраў для нацыянальных, кадравых і тэрытарыяльных часьцей.



Начальнік і камісар АБВШ т. Васілевіч.

Школа зьяўляецца нацыянальнай часьцю, якая рыхтуе пралетарскіх камуністычна - выхаваных, стойкіх камандзіраў РСЧА, ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку нашай партыі ў справе будаўніцтва нацыянальных фармаваньняў РСЧА.

Школа мае баявыя заслугі перад пралетарыятам Савецкага Саюзу і Беларусі па абароне Ленінграду ад звантур клясавых ворагаў, па абароне Савецкай Украіны і Крыму ад барона Ўрангеля, па абароне Беларусі ад бандытызму. У жорсткіх баёх на гэтых франтох школа страціла дзесяткі лепшых курсантаў і камандзіраў.

Выпушчаныя са школы камандзіры гэрэічна змагаліся ў баявых радох АДУЧА з наёмнікамі замежнага капіталу — белымі кітайскімі генераламі па абароне межаў СССР на Ўсходзе.

У 1930 г. школа дала лепшыя паказальнікі баявой падрыхтоўкі ў акрузе. Школа разгарнула вялікую грамадзка-палітычную работу па барацьбе за пранфінплян, за калектывізацыю і мэтадамі сацыялістычнага спаборніцтва за ажыцьцяўленьне загаду наркома па баявой падрыхтоўцы на бягучы навучальны год.

Школа і надалей будзе рашуча змагацца за ўзьняцьце баявой падрыхтоўкі на вышэйшую ступень за аўладаньне сучасной баявой тэхнікай на аснове ажыцьцяўленьня гэнэральнай лініі партыі па сацыялістычным будаўніцтве і барацьбы з усякімі ўхіламі ад ленінскай лініі партыі, на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

РВС БВА ўпэўнен, што начсклад і курсанты школы ўпартасьцю, настойлівасьцю і пляніраванасьцю ў рабоце выканаюць задачы па баявой падрыхтоўцы і ленінскім выхаваньні камандзіраў РСЧА.

Часов. камандуючы войскамі БВА ЗОНЕЭРГ.

Зг. члена РВС КОРАБАЎ.

Ударніні АБВШ, курсанты 2 роты т. т. Ляшчынін, Кіяшка, Котаў

Васемнаццаць лепшых

Іх 18 лепшых ударнікаў, загартаваных Ленінскім гартам. Яны цьвёрда, рашуча, упарта, па-бальшавіцку б'юцца за тэмпы, за якасьць і першымі ўсходзяць па вышыні, якія штурмуе ўся маса школы.

Яны лепшыя выявіцелі агульнага запалу, агульнага энтузіязму. Гэта байцы вялікай арміі працы, якія прыйшлі ў школу з калгасных палёў і фабрык, дзе яны палюбілі працу і змаганьне. Рабочыя фабрык і заводаў сёньня з гордасьцю прачытаюць проз вішчы гэтых лепшых курсантаў, учарайшых таварышоў па варштаце і гэтаху, вось яны: ТЯНЬКЕВІЧ, ЛІЦЬВІНАЎ, ЕРМАЛАЕЎ, ФІЛОНЧЫК, ЛЯШЧЫНІН, ФРАЛОЎ, ЛІСТРАЦЕНКА, ФРАЛКОЎ, БАЗЫЛЕНКА, КІЯШКА, КОТАЎ, КАЗАКЕВІЧ, МАРГЕЛАЎ, КАЗЛОЎ, ДЗЯРКАЧ, УДОТАЎ, БАРАДУЛЬКІН і ЛАЗЮК.

У характарыстыках іх чытаем: «Зьяўляецца кіраўніком ударніцтва ў сваім разьдзеле. Адстаючых бярэ на грамадзкі буксір, прымае актыўны ўдзел ва ўсёй грамадзкай партыйнай рабоце. Дысцыплінаваны. Мае падзякі». Вось іх заслугі перад школай, Чырвонай арміяй і Савецкай краінай. Сёньня яны будуць урачыста ўзнагароджаны ЦВК БССР.

Слава лепшым!

Б. АЖГІРЭЙ.

Пастанова ЦВК БССР

Да дзесяцігодзьдзя існаваньня Аб'яднанай Беларускай Вайсковай Школы імя ЦВК БССР

10-га лютага 1931 году спаўняецца дзесяць год існаваньня Аб'яднанай Беларускай Вайсковай школы імя ЦВК БССР. Заснаваная ў часы грамадзянскай вайны Аб'яднаная школа за час яе існаваньня адыграла вялікую ролю ў справе падрыхтоўкі чырвоных камандзіраў для нацыянальных і тэрытарыяльных вайсковых часьцей. Рыхтуючы для Чырвонай арміі загартаваных чырвоных камандзіраў з пешых рабочых, батракоў, сялян-беднякоў і актывістаў-сераднякоў, Аб'яднаная школа дала за гэты час Чырвонай арміі сотні клясавa сьвядомых, узброеных палітычнымі і ваеннымі ведамі і адданых рабочай клясе ў барацьбе за сацыялізм камандзіраў і гэтым з гонарам выканала сваю задачу—узмацненьня баяздольнасьці Чырвонай арміі і абароназдольнасьці Савецкай краіны.

Адзначаючы выдатныя заслугі Аб'яднанай Беларускай Вайсковай школы імя ЦВК БССР у справе падрыхтоўкі чырвоных камандзіраў, прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР пастанаўляе:

1. УЗНАГАРОДЗІЦЬ АБ'ЯДНАНАЮ БЕЛАРУСКУЮ ВАЙСКОВУЮ ШКОЛУ ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ.

2. Адзначаючы заслугі палітычна-камандзнага складу школы ў справе падрыхтоўкі вайсковых кваліфікаваных кадраў, узнагародзіць:

а) зброяй і граматай ад прэзыдыуму ЦВК БССР наступных асоб палітычна-камандзнага складу: Васілевіча І. І., Конюхава Н. Г., Варшэвіча М., Савєтнікава Я. Г, Уласава М. С. Лесненка, Гаранскага, Проніна, Ягорова, Міларадава, Казлоўскага, Пякурына Караулава, Храбрага, Уласава, Анкасава, Гарбатова, Дабралюбава, Федаровіча.

б) Ганаровымі граматамі ЦВК БССР наступных асоб з палітычна-камандзнага складу: Жырковіча, Балотнікава, Пабыпеца, Ганчарыка, Сырэца, Ленюўскага, Гарошка, Гусева, Раманова, Кавалёва, Ермакова, Савікова, Польта, Парынскага, Брэхава, Хутарцова, Грабоўскага.

3. Узнагародзіць Ганаровай граматай прэзыдыуму ЦВК наступных асоб сантаў школы, як правяўшых сябе клясава-вытрымаными, палітычна-сьвядомымі і найбольш старанными ў справе падрыхтоўкі да высокай годнасьці чырвонага камандзіра: Сянкевіча Пятра, Літвінава, Пятра, Ярмалаева Ўладзімера, Фралкова Марка, Лістраценка Базыля, Базылёнка Ўладзімера, Казакевіча Паўла, Фралова Антона, Філончыка Тодара, Ляшчыніна Базыля, Кіяшка Мікалая, Котава Івана, Маргелава Базыля, Казлова Луку, Дзяпкача Івана, Удотава Алеся, Мазюка Дзьмітра, Барадулькіна Рыгора.

Прэзыдыум ЦВК выказвае ўпэўненасьць, што выхаванцы АБВШ імя ЦВК, атрымаўшы бальшавіцкую загартаванасьць і вайсковую падрыхтоўку, школа пад кіраўніцтвам лепшых настаўнікаў — удзельнікаў грамадзянскай вайны, будуць на належнай вышыні сваёй ганаровай годнасьці і з гонарам выканаюць свой баявы абавязак па абароне пралетарскай рэвалюцыі ў час капі гэтага ад іх патрабуе камуністычная партыя і савецкі ўрад.

СТАРШЫНЯ ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

САКРАТАР ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ БССР А. ХАЦКЕВІЧ.

9 лютага 1931 г.

А. Альшэўскі

Чырвоныя камандзіры першай ударнай брыгады міжнароднага пралетарыяту

(Да 10-й гадавіны АБВШ)

Увесь буржуазны сьвет з выключнай увагай сочыць за разьвіцьцём і ўзмацненьнем нашай Чырвонай арміі. Асаблівую ўвагу ворагі СССР аддаюць камандзкаму складу Чырвонай арміі, прабуючы разгарнуць невырашальную для іх загадку аб тым, як гэта адарылася, што армія рэвалюцыі і партыя, якая кіруе рэвалюцыяй, здолелі стварыць свой «чырвоны афіцэрскі корпус», які па сваіх кваліфікацыях, як прызнаюць самі ворагі, ня ўступае любой буржуазнай армії, маючай у сваім багажы стагодзьдзі ваенных традыцый і вопыту.

Рыхтуючыся да вайны супроць Савецкага Саюзу, імпэрыялісты ўсіх краёў усё часьцей прымушаны з трывогай канстатаваць узрастаючую магутнасьць Чырвонай арміі і яе камандзнага складу. Той факт, што камандзіры Чырвонай арміі зьяўляюцца «плотью от плоти» рэвалюцыйных мас, што нашы вайсковыя школы і акадэміі рыхтуюць такіх камандзіраў, якія дасканала ўладаюць ваеннай навукай і тэхнікай і разам з гэтым зьяўляюцца рэвалюцыйнымі камандзірамі—палохае ворага і прымушае яго біць трывогу. Жадаючы зьнайсьці якія-небудзь шчыліны паміж камандным складам і ўсёй арміяй, паміж арміяй і ўсёй краінай, паміж кіраўніцтвам арміі і бальшавіцкай партыяй, і не знаходзячы гэтых шчылін, ворагі ўсё з большым пэсымізмам гаворадь аб «невядомым заўтра», аб нямінучых ваенных сутыкненьнях паміж краінай сацыялізму і сьветам капіталізму.

У апошні час усё часьцей можна сустрэць на старонках прэсы капіталістычных даяржаў разважаньні на тэму аб Чырвонай арміі, яе баявых здольнасьцях і, асабліва, аб падрыхтоўцы камандзіраў Чырвонай арміі. У гэтых разважаньнях пытаньнем, якое найбольш часта паўтараецца, зьяўляецца пытаньне аб тым, ці змогуць чырвоныя камандзіры, выхадцы з рабоча-сялянскага асяродзьдзя (а такімі зьяўляецца большасьць нашага начскладу), ці змогуць яны супроцьстаяць ваенным сілам капіталістычнага Захаду. Нядаўна адна вялікая буржуазная газэта фашысцкай Польшчы «Ілюстраваны курэр подзаенны» прысьвяціла артыкул гэтай праблеме, спыняючыся ў прыватнасьці на начскладзе чырвонай кавалерыі. Гэты артыкул мае тую цікавасьць, што ён характарызуе настрої, якія ўсё больш часта прарываюцца на старонках буржуазнай прэсы.

Пасьля ўзгадкі аб тым, што ў Чырвонай арміі такой вялікай краіны, як наша, стаяць галоўным чынам камандзіры, якія выходзяць з рабочых і сялян, якія ў старой арміі «ў лепшым выпадку былі толькі унтэр-афіцэрамі і вахмістрамі», а цяпер камандуюць карпусамі і дывізіямі. Газэта прымушана прызнаць, што асноўны касьцяк начскладу РСЧА складаецца ў значнай сваёй частцы з членаў УсеКП(б) і мае за сабой вялізарны вопыт грамадзянскай вайны, з якой ён выйшаў пераможцам. Газэта для прыкладу бярэ вядомых усёй Чырвонай арміі камандзіраў карпусоў т. т. Цімашэнка, Зотава, Гарадзейкова і інш., апісвае іх мінулае і ставіць «страшное пытаньне»—што ўнясуць з сабою ў вайну будучыні (а да гэтай вайны буржуазія рыхтуецца з усіх сваіх сіл) усе гэтыя «простолюдины», якія ўпаўна працуюць над сваёй ваеннай кваліфікацыяй, і чым скончыцца нямінучая сутычка паміж Чырвонай арміяй і арміяй капіталістычных даяржаў. Газэта піша:

«Не падлягае сумненьню, што гэтыя стратэгі-самароднкі ўлягуць у вайну будучыні многа нечаканых момантаў, надаючы вайне асабліва яркі колярыт. Выпадкі паміж вучонымі і прафэсарамі, якіх стаяць заходняя армії на чале сваіх буйных баявых адзінак, і гэтым высунутымі рэвалюцыйнымі сынамі глухіх руокіх вёсак і казацкіх станіц, напэўна будзе надзвычайна цікавым»...

Газэта не бяз трывогі думае аб гэтых надыходзячых «выпадках», да якіх на ўсіх парах ідзе капіталістычны зах.ад, які імкнецца задушыць нашу краіну, які імкнецца ўзрушыць нашу краіну, аб разьвязцы гэтай сутычкі, прымушае на прызнаць высокія баявыя і палітычныя якасьці нашых камандзіраў, нашых «стратэгаў-самароднкаў».

«...Ваенная навука са сваімі вылічэньнямі сутыкнецца тут, як гэта часта адаралася ў гістэрыі, з валіварным тэмпэрамэнтам і інтуіцыяй гэтых народных стратэгаў. Ня будзе ў выніку гэтай сутычкі? Вось пытаньне, на якое ніхто палепей ня можа даць адказу. Часта навука б'е самароднкаў, але зусім нярэдка самароднкі падстройваюць навуцы злосныя штучкі, ставячы яе перад абліччам так званых «зусім новых праблем».

Зусім яшчэ жыдаўна, гаворачы аб нашых узброеных сілах і аб нашым камандным складзе ворагі безапэляцыйна вырашалі пытаньне аб лёсе будуна вырашалі пытаньне аб лёсе будуна вырашалі пытаньне аб лёсе будуна на ўзбраі карысьць. У прыведзеных вытрымках з артыкулу буржуазнай польскай газэты чуцны новыя ногкі—поткі вялікай трывогі і пэсымізму шаных прызнаньняў па адрасе тэй асаблівай сілы, якая заложана ў нашай арміі і нашых камандзірах. І калі газэта ў канцы свайго артыкулу заяўляе, што «праб'е час, калі замоўкне тэорыя, а слова возьме практыка вайны і толькі яна вырашыць хто мацнейшы», то ў гэтым мы пазнаем зусім відавочныя, зусім яўныя сумныя настрої ворагаў, якія ня могуць ня прызнаць узрастаючай сілы нашай арміі, арміі клясавай, арміі рэвалюцыйнай і яе камандзнага складу, гатовых на першым заўліку партыі і ўлады стаць на абарону рэвалюцыі.

Невыпадкова, што ў ацэнцы нашага камандзнага складу гэта газэта, як і увесь буржуазны друк, занастрае ўвагу на сацыяльным складзе камандзіраў, па іх паходжаньні і непарыўнай іх сувязі з рэвалюцыяй, з працоўнымі, з партыяй бальшавікоў. Невыпадкова другая польская газэта таксама не бяз нотак трывогі і пэсымізму заяўляе, што

«маладыя выхаванцы вайсковых школ і чырвоныя камандзіры вучацца рэвалюцыі і ўжо цяпер амаль палова афіцэрскага корпусу Чырвонай арміі належыць да камуністычнай партыі».

Зразумела, чаму іменна на гэты бок пытаньня зваротае сваю ўвагу наш вораг. Ён бачыць, што камандзір Чырвонай арміі, які выйшаў з працоўнага асяродзьдзя, аўладаў поўнасьцю і дасканала ваенай справай, што сярод камандзнага складу ёсьць такія «народныя стратэгі», змагацца з якімі ня так лёгка будзе вучоным ваенспэцам Захаду. Ён бачыць, што гэты тып рэвалюцыйнага камандзіра, які прайшоў баявую школу грамадзянскай вайны, а зараз хутка завалоўвае ваенную навуку і мастацтва карыстаньня самай разьвітай ваеннай тэхнікай, зьвязаны непарыўна з партыяй, якая будзе сацыялізм і вядзе свой бой пад сьцягамі Камінтэрну. Навука і тэхніка злучаныя з высокай палітычнай і клясавай сьвядомасьцю ўсёй арміі ад камандзіра да простага чырвонаармейца —вось чаго няма ў арміі буржуазіі і —вось чаго яна больш за ўсё баіцца.

Трывога ворага зусім законная. Такой арміі ён ніколі мець ня будзе. Такой непарыўнай сувязі паміж арміяй і камандным складам, паміж камандным складам і ўсёй краінай ён ня меў і мець ня будзе.

Сёньня мы адзначаем першае дзесяцігодзьдзе нашай Беларускай вайсковай школы імя ЦВК БССР. І ў гэты дзень, мы з асаблівым задавальненнем, сьвядомасьцю нашай узрастаючай сілы можам прачытаць тое, што піша аб нас нераапалоханы нашым ростам вораг. На прыкладзе АБВШ мы можам паказаць, што наша Чырвоная армія атрымлівае новыя кадры дасканалых камандзіраў, якія ўпэўнаюць да сябе пашану ворага і выкліканюць трывогу і страх за будучыню з боку гэтага ворага. Мы з вялікім задавальненнем можам яшчэ раз у сувязі з юбілеем АБВШ пакланіць ворагам, што і гэта, які ў ўсё ёй падобныя кузьні чырвоных камандзіраў, складаецца выключна з рабочых і сялян, што пронаст камуністаў і камсамольцаў у ёй роўны амаль 80, што яна моцная падпрыманьнем працоўных мас і непарыўнай сувязью з імі, што яна верная лініі бальшавіцкай партыі.

У гадавіне АБВШ ёсьць яшчэ адзін надзвычайна важны момант—гэта наша нацыянальная палітыка, якую праводзіць партыя і ў адносінах да Чырвонай арміі. Дасягненьні АБВШ—гэта пад'агульненьне вынікаў, з якімі для нас плюсы, вынікаў практычнага ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі ў часьках Чырвонай арміі ў выглядзе будаўніцтва і ўмацаваньня нацыянальных фармаваньняў і падрыхтоўкі для іх камандных кадраў.

Ні ў якой буржуазнай арміі немагчыма такая нацыянальная палітыка, якую ажыцьцяўляе бальшавіцкая партыя ў Чырвонай арміі. Возьмем да прыкладу польскую армію. Амаль на 40 проц. яна складаецца з так званых «нацыянальных меншасьцей»—беларусаў, украінцаў, літоўцаў, немцаў і яўрэяў. Гэта армія, таксама як і ўсе фашысцкая краіна, зьяўляецца арміяй самага агіднага і бязьмежнага сацыяльнага і нацыянальнага ўціску. За карыстаньне сваёй роднай мовай салдата-украінца, салдата-беларуса караюць, як «ўнутранога ворага» польскай фашысцкай даяржавы. Беларускіх і украінскіх салдат пасылаюць, як правіла, служыць у адзіныя карэнныя польскія вобласьці. Ўнутры арміі распальваецца нацыянальная варожасьць і нянавісьць. Прымусовая палянізацыя беларускай, украінскай, яўрэйскай і г. д. дапрызыўнай і салдацкай моладзі зьяўляецца адной з падстаў іх «выхаваньня». Тое, што робіць нашу армію моцнай і непераможнай—мудрая ленінская нацыянальная палітыка, то цыматнацыянальны склад польскай, як і ўсякай іншай буржуазнай арміі, разлагае яе сілу, падрывае яе моц, становіцца буйным рэвалюцыйным фактарам.

Дасягненьдзьдзе АБВШ—гэта яркая практычная ілюстрацыя таго, як правільнае ажыцьцяўленьне нацыянальнай, рашучая барацьба супроць усяких шавінізмаў робіць нашу шматнацыянальную армію — адзінай згуртаванай, інтэрнацыянальнай баявой сям'ёй, якая гатова за ўсякі час абараняць межы Саюзу і змагацца пад сьцягамі сусьветнай рэвалюцыі, пад сьцягамі пралетарскага інтэрнацыяналізму. Нашы нацыянальныя фармаваньні зьяўляюцца непарыўнымі часьцямі ўсёй Чырвонай арміі. Нашы нацыянальныя часьці выхоўваюць у духу рэвалюцыйнага інтэрнацыяналізму, што стварае з нашай Арміі магутную сілу, што стаіць на варце Савецкага Саюзу ад ворагаў народаў, якія толькі ў выніку Кастрычніка, толькі пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі змаглі стаць і стаяць на шлях сапраўднага гаспадарчага і нацыянальна-культурнага росквіту. 10-цігодзьдзе АБВШ—гэта сьвята ўсіх працоўных БССР, гэта яшчэ адзін паказальнік таго, як правільна праводзіць нацыянальную палітыку КП(б)В і яе Цэнтральны Камітэт пад кіраўніцтвам бальшавіцкага ЦК УсеКП(б).

Мы ніколі не забываем, што наша БССР зьяўляецца фарпостам Савецкага Саюзу. Гэта ўскладае на нас цэлы рад выключна адказных абавязацельстваў і задач. Мы ні на адну хвіліну не павінны выпускаць з-пад увагі шпаркага нарастаньня ваеннай небясьпекі. Аб гэтай небясьпецы памятае і павінна цьвёрда памятаць увесь час наша школа, якая падагульвае вынікі слаўнага і гэрэічнага 10-цігодзьдзя.

Трэба памятаць, што чым больш мы чуем мірныя балбатні ў Жэневе, чым больш «распаркліваются» у міралюбівых замоўненьнях буржуазныя дыпламаты, тым, значыць, мацней куецца зброя вайны, тым актыўней у тайнікох генэральных штабаў працуюць над закончаньнем плянаў інтэрвэнцыі. Нават па старонках буржуазнай прэсы пытаньні вайны і перш за ўсё вайны супроць СССР, стаіць у парадку дня.

Нямецкая газэта «Кельнінэ Цэйтунг» у сваім навагодным артыкуле пісала наступнае:

«Напружанасьць адносін, якая скрыецца у атмасфэры 1930 г., раўнасільна тэй, якая панарадзила паўтара дзесяцігодзьдзя таму назад сусьветную вайну. Іскры ляцяць да парахавой бочкі і правільны заклік у году навагодняю ночы ня ёсьць ніякім тост у славу будучага году, а пажаданьні зварот да кожнага і да ўсіх: сьцішайцеся, інакш будзе позна»!

Адна з польскіх газэт піша:

«Эўропа знаходзіцца зараз як-бы на вулкане. Польшча-ж знаходзіцца ў кратэры гэтага вулкану, як асаблівае геаграфічнае і палітычнае становішча ўскладае на яе асаблівыя задачы гістарычнага значэньня».

Аб чым з такой цынічнай ясьнасьцю гаворыць буржуазная прэса? Да чаго заклікае рыхтаецца яна? Аб якіх «асаблівых задачах гістарычнага значэньня» гаворыць польская газэта?—Для кожнага з нас гэта ясна! Вайна!—вось адказ капіталізму на ўсе свае шматлікія супярэчнасьці на ўсе свае нарыпаючыя хваробы, на рост рэвалюцыйнай хвалі і перш за ўсё—вось адказ на вялікія посьпехі Саюзу Савецкіх, які будуе сацыялізм і ўжо ў гэтым годзе завяршае пабудову фундамэнту сацыялістычнай эканомікі і, гэтым самым падрывае ўстої капіталістычнага сьвету.

З гэтай міжнароднай абстаноўкі вынікаюць і нашы задачы, якія стаяць таксама і перад нашым слаўным юб

270 проц. больш, чым у мінулым годзе

У трэцім рашаючым у БССР будзе здабыта 658 тыс. тон торфу

На буйнейшым тарфяным заводзе Беларусі «Асінторф» адбыўся другі пленум ЦП саюзу гарнарабочых БССР.

У рабоце пленуму прынялі актыўны ўдзел усе рабочыя торфазаводу.

Быў заслухан даклад аб прамфінпляне тарфяной прамысловасьці на 1931 год.

Выключны энтузіязм рабочых пад ленінскім кіраўніцтвам камуністычнай партыі дае магчымасьць на аснове мэханізацыі торфараспрацовак, выканаць пяцігадовы плян тарфяной прамысловасьці за тры гады.

У бягучым годзе паводле пляну павінна быць здабыта 658 тыс. тон торфу —павялічэньне ў параўнаньні са здабытчай мінулага году на 270 проц. У тарфяной прамысловасьці будзе занята 13 тыс. рабочых—на 62,5 проц. больш, чым у мінулым годзе. Капітальныя ўкладаньні вызначаны ў 4 млн. 600 тыс. рублёў; з іх на жыллёвае будаўніцтва—798 тыс. руб., на культурна-бытавое—345 тыс. рублёў, на падрыхтоўку кадраў—153 тыс. рублёў.

Прадукцыйнасьць працы павінна быць узьнята на 26 проц., сабекошт прадукцыі—зьніжаны на 11 проц.

У мінулым годзе ў тарфяной прамысловасьці быў ліквідаваны прарыў.

Плян здабычы торфу быў выканан толькі на 68,9 проц., сабекошт прадукцыі—павышаны на 23 проц. і г. д.

Прарыў быў выклікан поўнай непадрыхтаванасьцю гаспадарчых і прафсаюзных арганізацый да сэзону торфаздабычы.

Саюзторф не забясьпечыў патрэбнай колькасьці машын і абсталяваньня. Недахват кадраў кваліфікаваных рабочых і тэхнічнага пэрсаналу (сьлесароў, машыністаў, тарфмэйстраў і інш.) прыводзіў да частых прастояў.

Вярбоўка рабочай сілы праводзілася бяспляна і часта на торфараспрацоўкі пралазілі кулацкія элемэнты.

Плян здабычы торфу ня быў даведзен да кожнага рабочага. Рабочае забясьпячэньне было пастаўлена вельмі дрэнна.

Прафарганізацыі ня здолелі стаць на чале творчага энтузіязму рабочых мас, кіраваць сацыпаборніцтвам і ўдарніцкім рухам.

Пленум поўнасьцю ўхваліў прамфінплян тарфяной прамысловасьці на трэці рашаючы год пяцігодкі і патрабаваў ад Белторфу, прэзыдыуму ЦП саюзу, гаспадарнікаў і тарфкомаў свячасова падрыхтаваць да новага сэзону. Прафарганізацыям узяць кантроль над выкананьнем гэтай пастановы.

Пленум таксама ўхваліў новы фрэзэрны мэтад здабычы торфу, адзначыўшы неабходнасьць падрыхтоўкі новых кадраў кваліфікаваных рабочых.

На жаль, гаспадарнікі да гэтага часу нічога це зрабілі для забясьпячэньня торфазаводаў рабочай сілай.

Пленум прапанаваў забясьпечыць у бягучым месяцы перавод усіх торфазаводаў на 6-цідзённы бесьперапынны тыдзень.

***

На пленуме быў заслухан даклад аб падрыхтоўцы да веснавой пасеўнай кампаніі.

Пленум пастанавіў арганізаваць на прадпрыемствах заводах рабочыя брыгады для праверкі выканаьня праграмы першага кварталу бягучага году па выходзе з фасфарытнай мукі.

Заўкомы фасфарытных заводаў разам з комітэтамі саюзу сельгасрабочых, рабкомамі саўгасаў і праўленьнямі калгасаў арганізуюць «сквозные» брыгады для праверкі выканаьня фасфарытнымі заводамі сваіх праграм, паўнасьці фасфарытнай мукі і г. д.

На прадпрыемствах рабочымі будуць прапрацаваны пастановы аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб кантрольных лічбах на 1931 год і пастанова СНК БССР аб веснавой пасеўнай кампаніі.

ЦЫВЕС.

Да пуску 1-га ў БССР экстрактавага заводу

Рэчыца Экстрактавы завод імя Варашылава

У дзень урачыстага пуску першага ў БССР экстрактавага заводу шчыра вітаю рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал з новай перамогай пралетарыяту на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Вітаючы вас, я спадзяюся, што гэты завод будзе ўдарным і прыкладным як па выкананьні прамфінпляну, так і па якасьці выпусканай прадукцыі.

Няхай жыве камуністычная партыя!

Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!

Няхай жыве сацыялізм!

Намесьнік старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. БЭНЭК.

9-II—31 г.

ВЫКАНАЦЬ ДЫРЭКТЫВУ

Пастанова калегіі НК РСІ БССР ад 30 студзеня 1931

1. Адзначыць, што рад КК-РСІ праявіў недапушчальныя адносіны да выкананьня дырэктыў прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б аб арганізацыі часовых кантрольных брыгад. Асабліва няўважліва аднесьліся **Віцебская, Менская гарКК-РСІ, Магілеўская і Пухавіцкая райКК-РСІ.**

2. Прапанаваць пленумам Віцебскай ГарКК-РСІ, Магілеўскай і Пухавіцкай РайКК-РСІ абгаварыць прычыны няўважлівых адносін прэзыдыуму гэтых КК-РСІ да дырэктыў ЦКК КП(б)Б. У працягу дэкаднага тэрміну паведаміць прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б вынікі гэтага абгаварэньня.

Улічваючы, што Менская гарКК нядаўна арганізавана, абмежавацца катэгарычнай прапановай прэзыдыуму гар. КК на працягу 10 дзён ажыцьцявіць поўнасьцю памянёную дырэктыву.

Прапанаваць усім КК-РСІ не пазьней 10 лютага даслаць у ЦКК-РСІ БССР матар'ялы аб працы часовых кантрольных брыгад.

3. Адзначыць, што **Сеньненская, Вушацкая і Астрашыцка-Гарадзецкая** райКК-РСІ справіліся з выкананьнем даручэньня ЦКК КП(б)Б і ў мэтах распаўсюджаньня вопыту Сеньненскай райКК, разаслаць усім райКК-РСІ адбітак дакладу Сеньненскага КК-РСІ.

4. Папярэдзіць усе КК-РСІ, што на невыкананьне гэтай аднэй з важнейшых дырэктыў ЦКК УсеКП(б) і КП(б)Б, якая накіравана на забесьпячэньне поўнага выканаьня фінансавага пляну рэспублікі, прэзыдыум ЦКК будзе жорстка рэагаваць.

5. Гэтую пастанову абвясьціць у друку.

Старшыня ЦКК КП(б)Бел. Нарком РСІ БССР КАЛНІН.

РАДЫЁ-УНІВЭРСЫТЭТ—

магутны сродак завочнага навучаньня

Вось ужо другі год, як пры Беларускім радыёцэнтры вядзе работу **Беларускі Рабоча-Сялянскі Унівэрсытэт па радыё.** У мінулым годзе ў ім займаліся **97** слухачоў, у гэтым годзе — **336** слухачоў. Асноўны кантынгэнт слухачоў—рабочая, калгасная і бядняцка-серадняцкая моладзь, настаўніцтва і палітасьветнікі.

Радыё-унівэрсытэт БССР прадстаўляе з сябе асаблівы від завочнага навучаньня. Перавага радыёнавучаньня перад звычайным завочным навучаньнем заключаецца ў тым, што студэнт мае магчымасьць сыстэматычна слухаць лекцыі па поўным факультэце, згодна вучэбнага пляну, выкарыстоўваючы для гэтага любую радыё-ўстаноўку.

Рэгулярнаму слуханьню лекцый па радыё спрыяе тая акалічнасьць, што перадачы радыё-унівэрсытэту адбываюцца штодня.

Радыё-унівэрсытэт падзяляецца на наступныя асноўныя аддзяленьні:

1) Факультэт працы і рацыяналізацыі, які мае мэтай аднаёміць слухачоў з рабочага актыву з асновамі сацыялістычнай рацыяналізацыі, з эканомікай працы, прамысловасьці, з арганізацыйнымі прынцыпамі прадпрыемства, з мэтадамі рацыяналізатарскай работы.

2) Факультэт калгаснага будаўніцтва, які падрыхтоўвае **з калгаснага актыву** брыгадзіраў, кіраўнікоў асобных галін гаспадаркі, ён імкнецца ўзброіць кожнага слухача гэтага аддзяленьня арганізацыйнымі прыёмамі калгаснага будаўніцтва, давесьці кожнаму няўхільнасьць, выгаднасьць і перавагу калектыўнага шляху разьвіцьця вёскі, зрабіць слухачоў прапагандыстамі калгаснага руху, практычнымі будаўнікамі сацыялізму. Адпаведна тэтаму і пабудован навучальны плян гэтага факультэту.

3) Факультэт савецкага будаўніцтва. Ён мае мэтай узьняць веды слухачоў гэтага аддзяленьня, якія вярбуюцца з сельсавецкага і раённага актыву, у галіне савецкага будаўніцтва, шляхам азнаямленьня іх з агульным навучаньнем аб дзяржаве, з асновамі канстытуцыі, з функцыямі ўсіх зьвеньняў савецкай сыстэмы, з асновамі права і рацыяналізацыі савецкага апарату, і

4) Пэдагагічны факультэт з аддзяленьнямі: палітасьветным і піянэрважатых. Гэты факультэт мае мэтай павышэньне пэдагагічнай кваліфікацыі настаўніцтва 1-й ступені, палітасьветнікаў і піянэр-важатых, азнаямленьне настаўніцтва і слухачоў — непастаўнікаў з сутнасьцю і асновамі камуністычнага выхаваньня, марксыцкай пэдагогікі, з сутнасьцю і значэньнем палітэхнізацыі школы, з асновамі і ўстаноўкамі палітасьветнай работы.

Значным недахопам трэба лічыць тое, што да гэтага часу Белрадыёцэнтрам ня вызначаны пэўныя на кожны дзень гадзіны перадач, а існуе падвойная сыстэма перадач — па няпарных лічбах з 20 з паловай да 22 гадз. і па парных — з 20 да 22 гадз. Гэта адбівае ахвоту ў слухачоў, якія не прызвычаіліся ды і ня могуць прызвычаіцца да такой арытмэтыкі.

Вось практычныя мерапрыемствы на бліжэйшы пэрыяд:

Трэба стварыць для радыё-унівэрсытэту пэўную лектарскую базу, налажыўшы ў аснову навуковы склад БДУ, Камвузу, Беларускай Акадэміі Навук і частку практычных працаўнікоў цэнтральных устаноў БССР.

Другое — гэта шырока папулярызаваць у друку сыстэму завочнага навучаньня па радыё, яго перавагі перад звычайным завочным навучаньнем.

Неабходна забясьпечыць радыё-унівэрсытэт адказнымі работнікамі, якія-б сталі на чале факультэтаў і адказвалі-б за іх работу, за выкананьне вучэбнага пляну гэтых факультэтаў.

Трэба забясьпечыць праверку работы слухачоў над заданьнямі, што ім пасланы, **у першую чаргу — праверыць** тых слухачоў, якія для працы абъяднаны ў групы, праз праверку, інструктаваньне, мэтадычную ім дапамогу з боку разьвітога кансультанта.

Нарэшце, вельмі неабходна шчыльней зьвязацца з рабочымі масамі БССР. Трэба дадаткова ўцягнуць ва унівэрсытэт новых слухачоў—рабочых з прадпрыемстваў БССР. **На буйнейшых прадпрыемствах БССР культсэктары прафарганізацый павінны арганізаваць сталыя адкрытыя аўдыторыі слухачоў радыё-унівэрсытэту.**

Радыё — магутны барацьбіт за сацыялістычную перабудову краіны. Скарыстаем-жа яго максымальна!

Ф. П. САДОЎСКІ.

Сёньня, а 7 г. веч. у памяшканьні 2-й школы

назначаецца

збор гарадзкіх авіяхімаградаў

Яўка ў форме абавязкова.

НА РАЁННЫХ ЗЬЕЗДАХ САВЕТАЎ

ШКЛОЎ. 5-га лютага адкрыўся раённы зьезд саветаў Шклоўшчыны. У сувязі з адкрыцьцём зьезду, у Шклоў прыбыў чырвоны абоз. арганізаваны калгасьнікамі, беднякамі і сераднякамі ў складзе каля 300 фурманак. Абоз прывёз 10 тон збожжа, 15 тон саломы, 5 тон мяса, і з пал. ільнянога семя, 1 тону канапель, 60 вазоў ільняной саломы і рад іншых культур.

З 5 па 8 лютага ўступілі ў калгас 43 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі і арганізаваны два новыя калгасы з 38-мі гаспадаркамі. 5 дэлегатаў зьезду падалі заявы аб уступленьні ў калгас. Першай падала заяву батрачка **Ляньцікова Лідзія,** якая запэўніла зьезд у тым, што будзе актыўна весьці работу сярод жанчын па ўцягваньні іх у калгас. Другую заяву падаў чырвоны партызан тав. **Прохараў** і г. д.

***

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Адкрыўся шосты зьезд саветаў **Мсьціслаўскага** раёну. Калгасьнікі, беднота і серадняцтва сустрэлі зьезд чырвонымі абозамі і арганізацыяй новых калгасаў. Ужо ў першы дзень работы зьезду абозамі здана дзяржаве 24 тыс. клг. збожжа.

За час з першага па 5-га лютага ў раёне **арганізавана 14 новых калгасаў. якія аб'ядналі 216 гаспадарак. У існуючыя калгасы ўступіла 206 гаспадарак.**

У ганаровы прэзыдыум зьезд, пад бурныя воплескі, выбраў т. т. **Сталіна, Молатава, Калініна, Варашылава, Андрэева, Гея, Шаранговіча, Галадзеда, Тэльмана** (ІКП), **Ленскага** (КПП) і **Кор чыка** (КПЗБ).

Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б, газэце «Зьвязда» і тав. Варашылаву.

***

ПЯТРЫКОВА. (Наш кар.). 5-га лютага ў г. Пятрыкове ўрачыста адкрыўся VI раённы зьезд саветаў. Выбраны кіруючыя органы зьезду і гаданоры прэзыдыум, у склад якога ўвайшлі т.т. **Сталін, Молатаў, Варашылаў, Калінін, Арджанікідзэ, Андрэеў, Гей, Галадзед і Ленскі.**

Зьезд паслаў прывітальныя тэлеграмы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР.

З прывітаньнем ад імя ўраду БССР выступіў на зьезьдзе т. **Дамброўскі.**

Зьезд заслухаў рапарты №-скага пагранатраду і вучбату. Яму рапартавалі дэлегаты ад калгасаў **«Сейбіт»,** нацыянальнага калгасу **«Зорка»,** «**Чырвонае Палесьсе»** і інш.

Спрэчкі па дакладу ўраду прайшлі пад лёзунгам бальшавіцкай самакрытыкі. У спрэчках выступіла 19 чалавек.

С.

***

ГОРКІ. VI зьезд саветаў прыступіў да сваёй дзелавой работы. З вялікай увагай быў заслуханы дэлегатамі даклад ураду. Калгасьнікі, беднякі і сераднякі дэманстравалі сваю адданасьць вышэйшаму органу ўлады ў раёне.

Чырвоны абоз з 800 фурманак рознага збожжа, 4 новыя калгасы ў Асталопаўскім сельсавеце, 1 новы калгас у Ліхачоўскім сельсавеце—вось падарунак зьезду саветаў.

— Адзіны шлях працоўнага сялянства — калектывізацыя,—гаворыць у спрэчках дэпутаты.

Увечары да памяшканьня, дзе адбываецца зьезд, прышлі рабочыя і служачыя гораду, студэнты акадэміі, каб прадэманстраваць сваю зьяднанасьць і перадаць гарачае прывітаньне зьезду.

Міх, Сенін.

У рэдакцыю паступілі прывітальныя тэлеграмы **ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР і газэце «Зьвязда»** ад зьезду саветаў: **Мазырскага, Мсьціслаўскага, Жлобінскага, Тураўскага, Шклоўскага, Спуцкага, Сіроцінскага, Старобінскага, Асьвейскага раёнаў, ад першага пленуму Магілеўскага гарадзкога савету і інш.**

Давыбары акадэмікаў БАН

РЭЗАЛЮЦЫЯ НАВУКОВАЙ АСАЦЫЯЦЫІ ПРЫ ЦП САЮЗУ МЭДСАНПРАЦЫ

Заслухаўшы даклад т. **Хазанава** аб рэарганізацыі БАН і вылучэньні ў яе склад навуковых работнікаў марксыцка-ленінскага фронту, агульны сход членаў навуковай асацыяцыі ўхваляе:

Вітаць абнаўленьне БАН, якое зробіць яе сапраўдную установай марксыцка-ленінскай думкі.

Падкрэсьліць каштоўнасьць арганізацыі катэдры па вывучэньні паводзін чалавека, новай навукі, што будуе свае погляды на марксыцка-ленінскай аснове.

Вылучыць у акадэмікі, як загадчыка катэдры паводзін чалавека, прафэсара пэўрапаталёгіі, дырэктара Белмэдінстытуту **М. Б. Кроля.**

ВЯРНУЦЬ ДАНБАСУ СТАРЫХ ГАРНЯКОЎ

Трэці год пяцігодкі азначае новы вялізарны крок у справе індустрыялізацыі СССР. Данецкі басэйн — адзін з галоўнейшых вытокаў энэргіі для ўсёй народнай гаспадаркі — набывае выключнае значэньне ў пляне індустрыялізацыі.

Тэмп і характар індустрыялізацыі ва многім будзе залежаць ад работы Данецкага басэйну. **Данецкі басэйн у 1931 годзе павінен даць 57,5 млн. тон вугалю.** Лічба гэта павінна разглядацца, як мінімальная. Усе працоўныя павінны ўжыць меры да таго, каб вызначаную пратраму ня толькі выканаць, але і перавыканаць, бо пратрава ў апале значна вышэйшая арыентовачная лічбы.

Запраектаваны рост здабычы на 1931 год і вызначаны арыентовачна на 1932 год патрабаўвае ад свайго выканаьня карэннай зьмены саміх рабочых працэсаў. Самая шырокая мэханізацыя стала неадкладнай задачай і ўжо ўзяты цьвёрды курс на дасягненьні вызначанай праграмы мэханізаванай здабычы, вытворчасьці ўрубавых машын, канвэераў, электравозаў.

Краіна патрабуе зараз, каб у адносінах якасьці апалу быў зроблен значны пералом у бок яго паляпшэньня. Вылаткаваньне апалу таксама павінна быць даведзена да мінімуму. Даная ўрадам дырэктыва—15 проц. эканоміі апалу—павінна быць выканана поўнасьцю.

Але выкананьне пастаўленай перад Данецкім басэйнам задачы на атрыманьні 57,5 млн. тон вугалю і разгортваньні падрыхтовак на 1932 год залежыць ад тых рабочых кадраў, якія ён будзе мець на працягу году.

Трэба неадкладна ўжыць сапраўдныя меры да стварэньня пастаянных кадраў рабочых на капальнях Данецкага басэйну.

Выходзячы з гэтага, зараз **трэстам «Вугаль» абвешчана вярбоўка праз зямляцтвы кадраў старых гарнякоў, што раней працавалі ў капальнях.**

У БССР прыяжджаюць 70 старых гарнякоў з Данецкага басэйну, якія раней жылі на Беларусі, у якасьці вярбоўшчыкаў.

Наркампрацы БССР, улічваючы важнасьць вугольнай прамысловасьці, асабліва значэньне Данецкага басэйну, прыступіў ужо да гэтай адказнейшай работы па зьбіраньні кадраў старых гарнякоў для Данбасу. Склікаюцца спэцыяльныя нарады райінспэктароў працы па пытаньні вярбоўкі старых гарнякоў Данбасу.

Трэба, каб партыйныя, камсамольскія, прафэсыянальныя і савецкія арганізацыі, асабліва калгасы, прынялі максымальны ўдзел у рабоце па вярбоўцы гарнякоў Данбасу, і аказалі рабочым-вярбоўшчыкам поўную дапамогу. Трэба памятаць, што **выкананьне праграмы па вугалі—гэта ёсьць перамога сацыялістычнай будоўлі.**

Карачоўцаў.

Выканаць планы лоўлі рыбы

Лоўля рыбы з натуральных сажалак — пад пагрозай. Студзеньскае заданьне ВЫКАНАНА толькі НА 59%. Ганебнае выкананьне студзеньскага пляну сьведчыць аб тым, што БЕЛРЫБАКСАЮЗ яшчэ не ўсьвядоміў усёй важнасьці лоўлі рыбы, не мабілізаваў на вырашэньне гэтай задачы сваю сетку.

Між тым, зімні ўлоў мае вялізарнае значэньне, бо ён дае рабочаму спажыўцу найбольш каштоўны прадукт — сьвежую марожаную рыбу.

У бліжэйшыя дні неабходна даб[illegible] ца РАШУЧАГА ПЕРАЛОМУ У СПРАВ[illegible] ЛОЎЛІ РЫБЫ. Каапэрацыйная сыст[illegible] ма павінна неадкладна выканаць а[illegible] паведныя дырэктывы ў галіне забес[illegible] пячэньня рыбацкіх арцеляй. Калга[illegible] цэнтр павінен ажыцьцёвіць пастанов[illegible] Эканомнарады аб арганізацыі ў ка[illegible] гасах спэцыяльных рыбацкіх брыга[illegible] якія павінны абслугоўваць сажалкі [illegible] раёне дзейнасьці калгасаў.

М. ВАФМАН.

Ліст у рэдакцыю

Паважаны таварыш рэдактар!

Дазвольце праз газэту, што рэдагуецца вамі, выказаць пратест супроць абураючай нядбайнасьці тэхнічных работнікаў Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва, якая выявілася пры выданьні аборніку маіх вершаў **«Штурм».**

Ня гледзячы на маю просьбу, ужо ня далі гранак для праўкі аўтарскай карэктуры. Калі-ж кніжка была ўжо надрукавана, у ёй аказалася шмат такіх тэхнічных памылак, якія скажаюць палітычны сэнс паасобных вобразаў і сказаў.

Я не кажу пра такую «стылізацыю», як замест слова **«віхуры»** (у арыгінале) — **«віхры»,** замест **«безбярэжны»**— **«бязбрэжны»,** замест **«нудзь»—«жудзь»,** не кажу пра скрозь пераблытаныя знакі прыпынку.

Але ў рукапісе было:

— Гэта ведае кожны калгасьнік:

Беларус, яўрэй і паляк!

У кніжцы-ж:

— Гэта ведае кожны калгасьнік!

Беларус і яўрэй і паляк!

Такіх прыкладаў ёсьць даволі. Паводле ўмоўленасьці з тэхрэдактарам БДВ ле ўмоўленасьці з тэхрэдактарам БДВ ле ўмоўленасьці з тэхрэдактарам БДВ